№№42–43
(3172–3173)

19—22 сакавіка 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

«ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ» ПА-БЕЛАРУСКУ

Ох, ужо гэтыя «тэхнічныя прычыны»!

...Усё адбылося зусім у іншым варыянце, чым задумвалася віноўнікам урачыстасці — паэтам і ініцыятарам выдавецтва "Беларускі кнігазбор" Кастусём Цвіркам. З нагоды выхаду 50-га тома з запраектаванай серыі ў 200 тамоў лепшых твораў нацыянальнай літаратуры ён запрасіў аматараў беларускага прыгожага пісьменства на імпрэзу, якая мелася быць у загадзя замоўленай канферэнц-зале сталічнага Палаца мастацтва.

Зразумела, Кастусь Аляксеевіч хваляваўся, рыхтуючы свята разам з сябрамі, але і падумаць не мог, што зрабіць падзею асабліва ўзрушальнай, запамінальнай і цікавай ім дапамогуць (хто б вы думалі?) ...нашы нястомныя і ўсюдыісныя, але не дужа далёкія ідэалагічныя забараняльшчыкі і непускальшчыкі. Здаецца, выстаўляць сябе на смех — іх улюбёны занятак.

Але аб усім па парадку. Калі госці ўрачыстасці ў прызначаны час прыйшлі на вечарыну, іх "прыветна" сустрэла наклееная на ўваходных дзвярах абвестка, што зала зачынена **"по техническим причинам"**... Учора яшчэ была гэтая зала жывая і здаровая, а сёння, глядзі, так занядужала, што тэрмінова, на ноч гледзячы, стала на рамонт...

Ох, ужо гэтыя **"тэхнічныя прычыны"**, сумназнаёмыя, нават звыклыя для нас апошнімі гадамі! Толькі збіраецца дэмакратычная грамада на сустрэчу, а ў загадзя аплачаным памяшканні то "міна закладзена", то дах валіцца, то пажар пагражае ўзгарэцца. Як кажа сучасны класік гумару, вёсела жывём!

На гэты раз сцэнарысты і рэжысёры "вясёлага" беларускага жыцця пралічыліся, атрымаўшы адваротны эфект. Над **"техническими причинами"** людзі проста смяяліся. Маўляў, ну і палёт фантазіі, хай бы што іншае прыдумалі. Хаця б **"по улице ходила большая крокодила"**, выпадкова забрыла ў палац і, не ўпадабаўшы ўбачаныя творы мастацтва, так раз'ятрылася — не падыходзь!

Смех смехам, а ў вестыбюлі палаца тоўпіліся ўжо сотні дзве чалавек. Не збіраючыся рэціравацца з панурымі галовамі, чакалі вынікаў перамоў К.Цвіркі з "інстанцыямі". Мала хто здзівіўся, пачуўшы пацвярджэнне адмовы, але ўсё поўна не разыходзіліся.

І тут, у момант няпэўнасці, на верхняй прыступцы лесвіцы з'явіўся рашучы, імпэтны Уладзімір Някляеў і голасам, які не патрабуе ніякіх мікрафонаў, звярнуўся да прыйшоўшых на свята, павіншаваў усіх з адметнай падзеяй у нацыянальным жыцці.

— Пяцьдзесят тамоў "Беларускага кнігазбору" — гэта пяцьдзесят цаглінак у скарбніцу беларускай культуры, і нам ёсць чым ганарыцца, — сказаў ён. — Беларускай нацыі ёсць што сказаць Богу творамі таленавітых сваіх сыноў.

— У нас вялікая літаратура, вялікая матчына мова, і калі іх будуць, як і раней, забараняць і не пускаць да людзей, мы павінны ісці сваім шляхам. Наша справа — выдаваць залатую класіку і пісаць новыя годныя творы, — пацвердзіў **Кастусь Цвірка**.

Анатоль Вярцінскі прачытаў свой верш-рэквіем у памяць сабраццяў старэйшых пакаленняў, каму быў прысвечаны адзін з томаў "Кнігазбору" пад назвай "Расстраляная літаратура". Слухачы, шчыльна стоячы плячо ў плячо, згадвалі разам з паэтам трагічныя часы сталіншчыны, калі творцаў знішчалі разам з іх кнігамі толькі за тое, што яны любілі сваю Бацькаўшчыну.

Дарэчы, прэзентаваны 50-ы том унікальнай серыі — гэта выбраныя творы класіка нашай літаратуры Максіма Гарэцкага, расстралянага ў 1938-м за тыдзень да свайго 45-годдзя. Яго пляменнік — акадэмік **Радзім Гарэцкі**, які браў удзел у падрыхтоўцы да выдання ранейшага тома "Браты Гарэцкія" пра сваіх слынных бацьку і дзядзьку, надзвычай высока ацаніў ролю "Беларускага кнігазбору" ў захаванні і распаўсюдзе ведаў аб лепшых здабытках духоўнай скарбніцы народа. Папоўніць яе публікацыяй выдатных прац-адкрыццяў амаль забытых навукоўцаў-беларусаў Мікалая Урончанкі і Іосіфа Хоцькі прапанаваў вучань Р.Гарэцкага **Аляксандр Ганчароў**.

Яркую меладычную фарбу ўнёс у вечарыну (адзін за ўсіх артыстаў, якім жадалі, ды не мелі магчымасці паўдзельнічаць у такой падзеі) знаны оперны спявак, адраджэнец музычнай спадчыны **Віктар Скарабагатаў**. Ён цудоўна выканаў жартоўную песню Станіслава Манюшкі на верш нашага класіка Яна Чачота. А потым, не згаворваючыся, і прысутныя заспявалі: узнёсла і прыгожа гучаў духоўны гімн "Магутны Божа", які многія ведаюць.

Настрой ва ўсіх, нягледзячы ні на што, быў прыўзняты. Хай і ў неардынарных умовах, а свята адбылося, акрыліла духоўным зарадам.

Ну а тых, хто яго баяўся аж да смешнага, варта пашкадаваць, бо ўласнага ценю баяцца. Якая там была "крамола", якая "контррэвалюцыя"?

У чарговы раз нашай інтэлігенцыі плюнулі ў твар. Але па сутнасці вышла... класічная унтэр-афіцэрская ўдава, якая сама сябе высекла.

...Прызнацца, ідучы пазаўчора на імпрэзу, я і не думала ні пра які рэпартаж, бо напярэдадні пра маючую адбыцца падзею падрабязна распавёў у "Народнай Волі" Кастусь Цвірка. Вы ж, нешаноўныя забараняльшчыкі, сваімі няўклюднымі і бессэнсоўнымі манеўрамі самі змянілі мае планы.

Дазвольце даць параду: лепш кіньце свае песні пра "лібералізацыю", адарвіцеся на хвілінку ад кіруючых крэслаў і вызірніце ў акно. Можа, заўважыце — на дварэ ўжо не 37-ы год мінулага веку, а XXI стагоддзе. І хай яшчэ не смелы, але подых вясны...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

ПАЛІТКУХНЯ

АГП можа зняцца з выбараў

Большая частка апытаных членаў палітсавета Аб'яднанай грамадзянскай партыі лічыць неабходным выхад партыі з выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў. Пра гэта БелаПАН паведаміў лідэр АГП Анатоль Лябедзька.

"Прайшло пасяджэнне Палітсавета партыі. Прыводзілася велізарная колькасць адкрытых злоўжываньняў пры фарміраванні выбарчых камісій, прыкладаў уціску на дэмакратычных актывістаў", — сказаў ён.

Па выніках абмеркавання сітуацыі вакол мясцовых выбараў Палітсавет АГП правёў галасаванне адносна фармату далейшага ўдзелу ў іх.

"Шасцёра членаў Палітсавета лічаць неабходным ісці на выбарах да канца, нягледзячы на парушэнні, 13 — заклікаюць звярнуцца з прапановай арганізаванага выхаду з выбарчай кампаніі АГП як палітычнай структуры", — паведаміў Лябедзька.

Найбліжэйшым часам АГП мае намер правесці апытанне адносна далейшага фармату ўдзелу ў мясцовых выбарах астатніх членаў Палітсавета, якія не змаглі ўзяць удзел у сённяшнім пасяджэнні, а таксама патэнцыяльных кандыдатаў у дэпутаты.

Плануецца, што з канчатковым фарматам далейшага ўдзелу ў выбарах АГП вызначыцца на з'ездзе 21 сакавіка.

ДЗЕНЬ ВОЛІ

Аляксей ЯНУКЕВІЧ: *«На Бангалор людзей не павядзём»*

У Мінгарвыканкам пададзена заяўка на масавае святкаванне 92-х угодкаў з дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Заяўку на правядзенне акцыі падалі старшыня партыі БНФ Аляксей Янукевіч, лідэр Мінскай гарадской арганізацыі БНФ Віктар Івашкевіч і яшчэ дзесяць актывістаў партыі, якія зараз спрабуюць зарэгістравацца кандыдатамі ў дэпутаты на выбарах у мясцовыя Саветы.

Мяркуецца, што збор удзельнікаў святкавання 92-х угодкаў з дня абвяшчэння БНР адбудзецца 25 сакавіка ў 18.00 на пляцоўцы каля Акадэміі навук.

Адтуль арганізатары плануюць павесці людзей да сквера Янкі Купалы, дзе павінны адбыцца святочны мітынг і бардаўскі канцэрт.

"Для святкавання ў нас усё гатова. Будзе шмат бел-чырвона-белых сцягоў. Плануюцца выступленні як вядомых, так і маладых паэтаў", — гаворыць старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч.

Праўда, арганізатары мерапрыемства не выключаюць магчымасці, што ўлады не задаволяць заяўку на правядзенне мерапрыемства: "Такая верагоднасць вельмі вялікая", — лічыць Янукевіч. Шчыра кажучы, у нас ёсць некалькі сцэнарыяў правядзення акцый, але гаварыць пра ўсе пакуль не хацелася б. У выпадку забароны правядзення шэсця па прапанаваным намі маршруце мы будзем глядзець на абставіны. Важна тое, колькі людзей прыйдзе да месца збору, які ў іх будзе настрой. Адно магу сказаць дакладна ўжо зараз — на Бангалор людзей не павядзём".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Выбары з «жаночым тварам»

Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў вылучаны 25.474 прэтэндэнты.

Канкурэнцыя ў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў складае 5,4 кандыдата на месца, у абласныя Саветы — 1,8, у раённыя — 1,2 кандыдата. 60% прэтэндэнтаў вылучалася шляхам збору подпісаў, 35,2% — працоўнымі калектывамі, 2% — палітычнымі партыямі, астатнія — грамадскімі аб'яднаннямі.

Амаль палова прэтэндэнтаў — 44,6% — жанчыны, 6,3% — моладзь да 30 гадоў, 0,1% — грамадзяне Расіі. Усяго на выбарах павінен быць абраны 21.301 дэпутат у 1495 мясцовых Саветах. Рэгістрацыя кандыдатаў працягваецца па 25 сакавіка.

ВІНШУЕМ!

Беларус свету

Барыс Уладзіміравіч Кіт...

У бліжэйшыя дні гэтаму выбітнаму сыну Беларусі споўніцца 100 гадоў!

Яго ведаюць у Еўропе, Амерыцы, Аўстраліі, Азіі, Афрыцы...

Акадэмік сусветнай акадэміі астранаўтыкі.

Доктар філасофіі ў галіне матэматыкі, прафесар, сапраўдны "кіт" амерыканскай астранаўтыкі, аўтар першага ў гісторыі падручніка па ракетных палівах...

Яго імя разам з імёнамі славутых вучоных Амерыкі, прадстаўнікоў вышэйшага інтэлекту чалавецтва XX стагоддзя, замуравана ў капсуле часу ў сцяне Капітолія.

Жыццёвыя шляхі-дарогі Барыса Уладзіміравіча Кіта пачыналіся з Беларусі. Яго Бацькаўшчына — вёска Агароднікі Карэліцкага раёна. Ён вучыўся ў Навагрудскай гімназіі, Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя, актыўны ўдзельнік Сялянска-работніцкай грамады, выкладчык матэматыкі, дырэктар Віленскай, затым Навагрудскай беларускіх гімназій, Адміністрацыйна-гандлёвага інстытута ў Маладзечне...

Віншуючы Барыса Уладзіміравіча са 100-годдзем, "Народная Воля" пачынае з наступнага нумара друкаваць серыю матэрыялаў пра яго жыццё, яго адданасць Бацькаўшчыне, беларускай справе, пра яго вялікі ўклад у скарбніцу сусветнай навукі.

Аб тым, як пачувае сябе юбіляр, аб чым ён думае ў гэты няпросты час, што ён зычыць беларускаму народу і аб многім іншым, чытачам "Народнай Волі" раскажа яе галоўны рэдактар Іосіф Сярэдзіч, які сёння разам з групай прадстаўнікоў грамадскасці накіраваўся ў Франкфурт-на-Майне, дзе зараз жыве слынны сын Беларусі.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Святлана КАЛІНКІНА

Зграя

Не было раніцы, каб кагонебудзь з журналістаў "Народнай Волі" яшчэ да пачатку рабочага дня не чакалі людзі. У адзін такі дзень у рэдакцыю з Гомеля прыехала ўжо немаладая жанчына — маці аднаго з арыштаваных па так званай "паляўнічай справе" Галіна Баранава. І прывезла нам свой аповед пра тое, што ўсе гэтыя арышты — вынік вайны паміж мясцовым КДБ і міліцыяй: міліцыянеры нібыта назбіралі кампрамату на прадстаўнікоў спецслужбы, а тыя, каб прыкрыць скандал, наўпрост арыштавалі ўсіх, хто меў дачыненне да гэтай праверкі. А вось падставу для арыштаў выбралі "нейтральную" — незаконнае паляванне. Не на людзей — на дзікіх звяроў.

Кожны дзень у рэдакцыю прыходзяць, прыязджаюць, пішуць, тэлефануюць людзі з падобнымі гісторыямі. Кожны дзень мы іх выслухоўваем, чытаем іх дакументы і звароты да розных афіцыйных асоб з просьбамі аднавіць справядлівасць альбо вырашыць нейкую праблему. Што можам — робім. Хаця і мы, і нашы наведвальнікі добра разумеем, што прэса не ўсясільная, асабліва ва ўмовах беларускага Закона аб СМІ, які напісаны так, што з цябе вытрасуць і душу, і грошы, калі толькі ты надрукуеш хоць нейкую інфармацыю, не падмацаваную доказамі і дакументамі. А яшчэ і газету прыкрыюць. Бо галоўнае правіла любога недэмакратычнага рэжыму: сябрам — усё, ворагам — закон. Тыя, хто не ўсхваляе норавы сённяшняй кіруючай эліты ў Беларусі, — ворагі. Таму і ідуць людзі калонамі да недзяржаўных журналістаў у пошуках праўды. Ім больш няма куды ісці. З афіцыйных структур яны атрымоўваюць толькі адпіскі, з іхнімі праблемамі ніхто і разбірацца не хоча, іх лісты і скаргі адфутбольваюць без тлумачэнняў і аргументаў, прычым часцяком адказы пішуць тыя самыя чыноўнікі, на якіх чалавек скардзіўся.

Прыблізна з такой бядой прыйшла да нас і Галіна Баранава. З жанчынай размаўляла Марына Коктыш. Уважліва выслухаўшы, патлумачыла, што для газеты матэрыял напісаць нельга, бо не хапае доказаў. Паспачувала, параіла звярнуцца, калі будзе нейкая новая інфармацыя, выказала словы падтрымкі...

Вось і ўся гісторыя, якая мае, аднак, проста неверагодны, сенсацыйны, скандальны працяг. Такі, што сёння ўжо ўсе аўтарытэтныя журналісцкія арганізацыі свету гавораць пра Беларусь як пра паліцэйскую дзяржаву.

...Ці ў той самы дзень, ці ў іншы (ужо цяжка прыпомніць) у інтэрнеце, на сайце "Хартыя-97", з'яўляецца матэрыял пра тое, што сваякі міліцыянераў, арыштаваных па "паляўнічай справе", падрыхтавалі зварот да старшыні Еўрапарламента Ежы Бузека і маюць намер скардзіцца яму на беззаконне, якое творыцца ў нашай краіне. Яшчэ праз некалькі месяцаў на сайце "Белорусский партизан" з'явілася інтэрв'ю з капітанам міліцыі, які выконваў абавязкі начальніка аддзела па барацьбе з карупцыяй МУС і лічыўся адным з самых набліжаных да тагачаснага міністра Уладзіміра Навумава людзей — Вячаславам Дудкіным. Гэтага Дудкіна, расказваюць, КДБ таксама хацеў арыштаваць па "паляўнічай справе", бо гэта пад ягоным кіраўніцтвам працавалі гомельскія міліцыянеры, але капітан даведаўся, што рыхтуецца арышт, і паспеў збегчы з краіны. Назва матэрыяла з беглым капітанам міліцыі гаворыць сама пра сябе: "Капітан Дудкін: справу аб паляванні выкарысталі, каб схаваць карупцыю на самым версе".

Шчыра скажу, я з вялікай цікавасцю прачытала абодва вышэйназваныя матэрыялы, бо "паляўнічая справа", якую адразу засакрэцілі, з'яўляецца адной з самых гучных за апошні час. Не кожны дзень такое здараецца! На той падставе, што міліцыянеры незаконна забілі рысь, былі арыштаваны галоўныя барацьбіты з карупцыяй УУС Гомельскай вобласці. Гэта потым, пасля закрытага суда, высветлілася, што судзілі іх усё ж не столькі за паляванне на дзікіх звяроў, колькі за "паляванне на людзей" — нібыта яны незаконна збіралі інфармацыю на супрацоўнікаў КДБ.

Напэўна, з цікавасцю прачытаў гэтыя матэрыялы і на той момант кіраўнік Гомельскага УКДБ, які цяпер прызначаны на аналагічную пасаду ў Гродне, генерал Іван Корж. Для пачатку Корж падаў іск у гомельскі суд супраць Галіны Баранавай, каб абараніць свае гонар і годнасць. За той самы зварот у Еўрапарламент, паколькі жанчына і не адмаўлялася, што пісала яго. Суд генерал выйграў, але палічыў, што гэтага мала, яму спатрэбіўся большы рэзананс. Літаральна напярэдадні Новага года, 31 снежня, была ўзбуджана крымінальная справа па факце распаўсюджання ў інтэрнеце нібыта паклёпніцкіх матэрыялаў на паважанага генерала. За расследаванне ўзялося Гомельскае УУС.

Па відавочнай справе разгарнулі цэлае следства, якое з Гомеля перакінулася ў Мінск. Можа, ім няма чым займацца, можа, яны дрэнна вучыліся на юрыдычным факультэце, але ўзбуджаная справа па артыкуле КК "Паклёп" перакінулася на людзей, якія проста не могуць мець да яго ніякага дачынення. Справа ў тым, што гэта вельмі канкрэтны артыкул, які прадугледжвае вельмі канкрэтны "склад злачынства".

Так, пра чалавека можна распаўсюдзіць лухту — непраўдзівыя звесткі. У гэтым няма крыміналу, хаця адміністрацыйнае пакаранне прадугледжваецца — часам штрафам, а бывае дастаткова прынесці пакрыўджанаму прабачэнні. А вось паклёп — гэта калі вы ведаеце праўдзівую інфармацыю, але свядома, заведама распаўсюджваеце лжывыя звесткі. Тую ж Галіну Баранаву ў паклёпе на Івана Каржа абвінавацілі было проста нельга, бо яна не мела дачынення да праверкі маёмасных, фінансавых і іншых спраў генерала. Пісала ў лісце пра тое, што чула, і верыла таму, што чула. Вось і пакаралі жанчыну за распаўсюджванне непраўдзівых звестак. Капітан Дудкін, як можна зразумець з ягоных інтэрв'ю, меў дачыненне да праверкі. Калі тое, што ён расказвае, няпраўда, то менавіта яго фармальна можна абвінаваціць у паклёпе. Але, як нядаўна заявіў міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў, "Дудкіна ніхто не шукае". У той жа час...

Крыху больш за месяц таму ў рэдакцыю газеты "Народная Воля" літаральна ўварваліся агрэсіўныя маладыя людзі ў цывільным і, загадаўшы ўсім "выключыць мабільныя тэлефоны", паведамілі, што яны маюць санкцыю на вобыск працоўнага месца Марыны Коктыш. Забралі камп'ютэр. Праз некалькі дзён я падыходзіла да дзвярэй сваёй кватэры, калі з верхняга лесвічнага пралёту "зваліліся" хлопцы з навіной, што яны маюць загад шукаць і ў маіх дамашніх камп'ютэрах інфармацыю пра Івана Каржа. Прычым увогуле без якіх-небудзь пытанняў: ці я ведаю, хто такі Корж; ці сустракалася хоць з адным чалавекам, які хоць бокам, хоць вокам меў дачыненне да Каржа і да "паляўнічай справы"...

Шчыра кажучы, у рэдакцыі мы да ўсяго гэтага паставіліся несур'ёзна, як да нейкага відавочнага глупства. Ну, абмеркавалі паміж сабой, ну, падзівіліся, але нават у газеце вырашылі нічога не публікаваць — неяк няёмка пісаць пра саміх сябе, тым больш у сітуацыі, калі прычынай стала нейкая недарэчнасць. Але 16 сакавіка журналістаў Мінска проста накрыла хваля аблаў і вобыскаў, і адразу стала зразумела, што адбываецца не глупства і не недарэчнасць, а спецаперацыя. Людзі ў цывільным уварваліся ў кватэру, якую арандуюць хлопцы і дзяўчаты, што робяць сайт "Хартыя-97". Некаторыя з "візіцёраў" нават твары хавалі пад чорнымі маскамі. Уварваліся з такім напорам, што наша калега Наталля Радзіна зараз ходзіць з фіялетавым вокам — яе ўдарылі па твары.

Практычна адначасова "брыгада" прыйшла з вобыскам у кватэру карэспандэнта расійскай "Новой газеты" ў Беларусі Ірыны Халіп... Вынеслі камп'ютэры "Хартыі", прыехалі ў "Народную Волю", каб забраць мой працоўны камп'ютэр... Марына Коктыш выходзіла з работы — яе запрасілі праехаць па маршруце "работа—дом": тут ужо была санкцыя на вобыск кватэры... Скончылі вобыск у кватэры Халіп — паехалі да яе мужа, палітыка Андрэя Саннікава. У рэшце рэшт абшукалі і кватэру Наталлі Радзінай...

Што гэта? Ці яны звар'яцелі? Ці ў нашай краіне ўжо кіруе нейкая хунта, якая без усялякіх падстаў можа ўварвацца да любога і любога абшукаць?

Згодна з законам, для вобыску павінны быць падставы. Прычым не чыесьці фантазіі ці так званая "аператыўная інфармацыя" (бо пад гэтую фармулёўку праваахоўнікі вельмі любяць падводзіць свае домыслы), а канкрэтныя доказы, якія грунтуюцца на канкрэтных фактах і сведчаннях.

Узровень доказаў у маёй сітуацыі прапаную ацаніць кожнаму чытачу газеты. Згодна з пастановай, мае камп'ютэры забралі на той падставе, што яны маюць інфармацыю, нібыта я з'яўляюся рэдактарам... сайта "Хартыя-97". Вось дзіва! А чаму не сайта Адміністрацыі прэзідэнта альбо тэрарыстычнай арганізацыі Аль-Кайеда?.. Шчыра сказаць, я ўвогуле даведалася, дзе знаходзіцца офіс "Хартыі", толькі ў дзень вобыскаў, калі стала вядома пра здарэнне і журналісты склікалі адзін аднаго на месца падзей.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ПАЗІЦЫЯ

Аляксандр Ярашук — за «адзінага»

Без кансалідацыі дэмакратычных сіл немагчыма перамога апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах. Аб гэтым заявіў на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадзянскай ініцыятывы "Рада беларускай інтэлігенцыі" старшыня Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў **Аляксандр Ярашук**.

Паводле яго слоў, няма ніякіх апраўданняў раздробленасці, пры якой апазіцыя пазбаўлена шанцаў на выбарах кіраўніка дзяржавы. Ярашук лічыць, што ўдзел мноства слабых кандыдатаў ад апазіцыі прывядзе да легітымізацыі існуючай улады і кансервацыі сітуацыі на доўгі тэрмін.

Прафсаюзны лідэр перакананы, што аб'яднанне з'яўляецца выйсцем з "надзвычайнай сітуацыі", у якой знаходзіцца апазіцыя. Паводле яго слоў, ператварэнне апазіцыйнай дзейнасці ў палітычны бізнес і прывяло да крызісу ў дэмакратычных сілах. Ярашук лічыць, што ўсе прыхільнікі дэмакратыі і абароны правоў чалавека павінны *"не гуляць у палітыку, а дзейнічаць гістарычна адказна"*.

Прафсаюзны лідэр заклікаў Раду беларускай інтэлігенцыі прыкласці ўсе намаганні і свой аўтарытэт для таго, каб заклікаць лідэраў дэмакратычных сіл да адказнасці за ўдзел у палітычным працэсе, а таксама схіліць іх да кансалідацыі. На яго думку, вылучэннем адзінага кандыдата павінны займацца эксперты з вядомых, паважаных у краіне людзей, якія засведчылі незаангажаванасць і паставілі галоўнай мэтай вылучэнне сапраўды перспектыўнага кандыдата, які набярэ больш за палову галасоў выбаршчыкаў. *"Гаворка ідзе пра людзей, якія ні пры якіх абставінах не дазволяць маніпуляваць сваім сумленнем"*, — падкрэсліў Ярашук.

"Адзіны кандыдат ад дэмакратычных сіл на выбарах кіраўніка дзяржавы стане знакам беларускай грамадзянскай супольнасці і ўсяму свету аб тым, што ў краіне ідуць сур'ёзныя працэсы, якія могуць прывесці да сапраўдных перамен", — адзначыў Ярашук. Ён перакананы, што сумесныя дзеянні апазіцыі могуць адрадзіць сярод людзей веру ў перамогу.

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19—22 САКАВІКА 2010 г.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

Жыллё даражэць не будзе

Якая сітуацыя склалася на рынку жылля? Рыэлтары, забудоўшчыкі, прадстаўнікі міністэрстваў практычна ў адзін голас кажуць, што жыллё (як купля-продаж, так і арэнда) будзе толькі расці ў кошце. Гэта значыць купляй сёння, бо заўтра будзе даражэй. Ці так гэта? Паспрабуем разабрацца.

Дынаміка рынка

На сёння па Беларусі на рынку нерухомасці склалася наступная карціна. Зараз 1 кв. метр жылля ў Мінску каштуе 1300—1700 долараў на другасным рынку жылля (калі разглядаць кошты на навабуды, дык 900—1400 долараў), у Гродне — 700—1300 дол./кв.м, Магілёве — 800—1200 дол./кв.м, Рагачове— 460—590 дол./кв.м, Полацку — 570—790 дол./кв.метр.

Хаця далейшы аналіз рынку нерухомасці будзем весці па Мінску, але варта адзначыць: дынаміка змянення коштаў на кватэры як у Мінску, так і па ўсёй астатняй Беларусі прыкладна аднолькавая.

Але спачатку прааналізуем, якія кошты на квадратны метр былі ў розныя гады ў Мінску. Кропкай адліку на арганізаваным рынку нерухомасці можна лічыць 1999 год. Чаму менавіта гэты год? Тут адбылося супадзенне некалькіх фактараў. Першыя пераўтварэнні на рынку жылля Беларусі пачаліся ў 1991—1992 гадах, калі быў падрыхтаваны і ўведзены ў дзеянне Закон аб прыватызацыі жыллёвага фонду, што дазволіла пачаць рэфармаванне жыллёвай сферы. Дзякуючы гэтаму закону да канца 1999 года па Беларусі было прыватызавана каля 1 мільёна кватэр, што дазволіла стварыць другасны рынак жылля. Гэтая акалічнасць падштурхнула дзяржаву звярнуць увагу на гэты рынак. За 1998—1999 гг. быў прыняты шэраг заканадаўчых актаў, што тычыліся розных аспектаў дзейнасці розных інстытуцый на жыллёвым рынку Беларусі. Таксама ў 1999 годе Беларусь крыху аправілася ад крызісу 1998 года, паступова сталі расці ўсе сектары эканомікі, у тым ліку банкаўскі, рост якога павінен быў стаць фактарам росту на рынку нерухомасці.

Так, у 1999 годзе квадратны метр аднапакаёвай кватэры (35 кв.м) у мікрараёне каштаваў у сярэднім 350 долараў. Але крызісныя з'явы ў эканоміцы былі яшчэ даволі моцныя, і да таго ж прапанова кватэр амаль у 5 разоў перавышала попыт (14.563 супраць 3307). Таму кошты на кватэры працягвалі падаць. І ўжо ў 2000 годзе сярэдні кошт квадратнага метра дасягнуў 275 долараў. Зараз цяжка ўявіць, але аднапакаёвая кватэра ў Чыжоўцы ці Шабанах тады каштавала 9500 долараў.

Але з 2001 года назіраецца рост на рынку жылля. Гэтаму, безумоўна, садзейнічала тое, што адным з прыярытэтаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь стала менавіта жыллёвае будаўніцтва. У рамках выканання гэтай праграмы быў прыняты шэраг захадаў для паляпшэння сітуацыі на жыллёвым рынку. Так, адпаведным міністэрствам і ведамствам даводзіліся паказчыкі па аб'ёме ўводу новага жылля на наступны год. Здавалася б, пачало ўзводзіцца больш жылля і гэта павінна яшчэ знізіць кошты на рынку. Але рост будаўнічай галіны пацягнуў за сабой рост і іншых сектараў беларускай эканомікі. У дадатак у беларускую эканоміку пачалі паступаць сур'ёзныя сродкі ад нафтавага экспарту, таксама вырас экспарт беларускай прадукцыі на растучы расійскі рынак. І вось ужо ў 2002 годзе сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёўкі ў Мінску складае 360 долараў.

Усе наступныя гады назіраецца тэндэнцыя росту коштаў квадратнага метра: 2003 г. — 450 дол./кв.м, 2004 г. — 620 дол./кв.м, 2005 г. — 900 дол./кв.м, 2006 г. — 1100 дол./кв.м, 2007 г. — 1900 дол./кв.м, 2008 г. — 2000 дол./кв.м.

Свайго апагею кошты на жыллё дасягнулі летам 2008 года. Яшчэ на пачатку 2008 года шмат якія эксперты і аналітыкі прадказвалі далейшы рост коштаў, але першыя прыкметы крызісу пачалі праяўляцца ў Беларусі ўжо ў верасні 2008 года, і першым адчуў гэта на сабе першасны рынак жылля (навабуды), бо гэты рынак мае большую залежнасць ад крэдытных рэсурсаў.

Далей наглядалася даволі імклівае падзенне коштаў, і ўжо летам 2009 года сярэдні кошт квадратнага метра дасягнуў 1500 долараў. У канцы года да крызісных з'яў у эканоміцы дадалося сезоннае падзенне коштаў на кватэры. І ўжо сёння аднапакаёвая кватэра (35 кв.м) у панельным доме ў спальным раёне Мінска каштуе 43—46 тыс. долараў. Гэта прыкладна 1300 дол./кв.метр. Кошты на першасным рынку зараз вар'іруюцца ў межах 900—1400 дол./кв.метр.

Сітуацыя ў перспектыве

Але як будзе развівацца сітуацыя на рынку далей? Рыэлтары ў каторы раз прагназуюць рост коштаў на кватэры, але іх прагнозы даволі стрыманыя — прагназуюць рост у межах 3%. Свой прагноз росту эксперты грунтуюць на тым, што пастановай Савета міністраў і Нацыянальнага банка №1749/19 у Мінску гадавое заданне па будаўніцтве жылля зніжана на 200 тыс.кв.м у параўнанні з 2009 годам — да 1,2 млн кв.метраў. Таксама яны адзначаюць, што рынак будаўніцтва Беларусі сур'ёзна зачынены ад замежных кампаній. Прыход на рынак такіх кампаній, як "Фішман-груп" і Маскоўская інвестыцыйная кампанія, хутчэй з'яўляецца выключэннем.

Безумоўна, гэтыя фактары згуляюць сваю ролю на рынку, але варта звярнуцца да фактараў росту кошту жылля з 2001-га па 2008 год. І мы пабачым, што асноўнымі фактарамі былі рост пакупніцкай здольнасці ўсіх груп насельніцтва, даступнасць крэдытавання, і, што асабліва важна, — павелічэнне памераў ільготнага крэдытавання.

Варта прыгадаць "залатыя гады" беларускай мадэлі эканомікі, калі наша эканоміка была ўмацавана доларамі ад нафтавага экспарту, беларускія тавары без перашкод плылі ракой на расійскі рынак, ды і іншыя рынкі, к прыкладу, Блізкага Усходу, Кітая, Індыі, былі больш плацежаздольнымі. У той жа час шмат якія катэгорыі насельніцтва маглі атрымаць адносна даступныя крэдыты на розныя патрэбы і асабліва на жыллёвае будаўніцтва. Частка беларусаў працавала за межамі краіны, у першую чаргу ў Расіі, а грошы везлі дахаты і ўкладалі ў першую чаргу ў нерухомасць.

Крызіс, што надышоў, ударыў па ўсіх сектарах беларускай эканомікі, але ў першую чаргу ён закрануў банкаўскі сектар, многія беларусы былі вымушаны вярнуцца дахаты з замежных заробкаў, шмат якія прамысловыя прадпрыемствы перайшлі на чатырохдзённы працоўны тыдзень. Вось і Белстат ужо год не фіксуе росту заробкаў, а напрыканцы 2009 — пачатку 2010 фіксуецца падзенне сярэдняга заробку па краіне. На пачатку 2009 года большасць банкаў спыніла выдачу крэдытаў, з лета назіралася паступовае аднаўленне крэдытавання, але працэнтныя стаўкі дасягаюць 25% гадавых. Большасць банкаў сутыкаецца з ростам праблемных крэдытаў. Практычна на ўсіх прадпрыемствах былі абрэзаны прэміяльныя фонды, дадатковыя зарплатныя фонды зусім былі скасаваны. На прыватных кампаніях пачаліся скарачэнні як шараговага персаналу, так і менеджменту. Іншымі словамі, даходы насельніцтва і грашовыя рэзервы папаўзлі ўніз. І пакуль аб зменах да лепшага не выпадае гаварыць.

Рэзервы ашчадных беларусаў

Фактараў, якія ўздзейнічаюць на рынак нерухомасці, даволі шмат, але самы галоўны з іх — гэта, безумоўна, пакупніцкая здольнасць насельніцтва. Рэзервы ў ашчадных беларусаў пакуль, вядома, ёсць. На гэтым і гуляюць рыэлтары і забудоўшчыкі, якія прагназуюць рост коштаў і раяць купляць зараз.

Але з прыведзенага аналізу можна зрабіць выснову, што кошт квадратнага метра расці ў бліжэйшы час не будзе (магчымы сезонныя хістанні на асобных сегментах), а да канца 2010 года магчыма нават зніжэнне коштаў на 1—3%.

Канечне, калі вы маеце 70—80% ад кошту кватэры на руках, тады магчыма ўзяць крэдыт на рэшту і купіць кватэру зараз. Калі ж азначаных працэнтаў няма, то вельмі непажадана ўлазіць у крэдыты.

Пры гэтым, калі ў вас ёсць 70% ад сярэдняга кошту аднапакаёвай кватэры (45.000х0,7= 31.500 долараў), то можна зрабіць хітрэй. Гэтая сума на банкаўскім рахунку будзе пры існуючых зараз стаўках па дэпазітах даваць вам штомесяц 205—210 долараў. Гэта сённяшні сярэдні кошт арэнды аднапакаёвай кватэры з мэбляй. Тым самым вы фактычна не губляеце грошы на арэндзе, жывяце ў гатовай кватэры, што дае вам час яшчэ пазбіраць грошы і абысціся без крэдыту для набыцця ўласнага жылля.

Віктар ЯЎМЕНЕНКА, эканаміст.

ПРА АЎТАРА

Віктар Яўмененка нарадзіўся ў Старобіне Салігорскага раёна. Пасля заканчэння Старобінскай сярэдняй школы паступіў у Мінскі фінансава-эканамічны каледж, які скончыў па спецыяльнасці "Фінансы".

Працягнуў адукацыю ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце па спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт". У 2006 годзе скончыў магістратуру БДЭУ, атрымаў ступень магістра эканамічных навук.

Свой працоўны шлях пачаў на дзяржаўным прадпрыемстве "Мінскі завод спецыяльнага інструмента і тэхналагічнай аснасткі" эканамістам па фінансавай працы. Да 2009 года фінансавы менеджэр у кампаніі ТАА "ЛБР-інтэртрэйд". Зараз працуе дырэктарам ТАА "Агра-Сэрвіс" (РФ, г.Смаленск), займаецца аналітыкай.

Перамога інваліда

Інвалід з Гродна Сяргей Фешчанка часткова дамогся праз суд кампенсацыі сваіх маральных і фізічных пакут, якія ён атрымаў у выніку падзення праз адсутнасць пандусаў на ганку будынка мясцовага ДАІ.

Суддзя Кастрычніцкага раёна Гродна Ганна Тракялевіч прыняла рашэнне часткова задаволіць фінансавыя патрабаванні пацярпелага. Сам Сяргей Фешчанка задаволены рашэннем суда. Але пытанне з безбар'ерным асяроддзем застаецца для ДАІ адкрытым. Бо ў праграме на наступныя гады будаўніцтва пандуса ля гэтага будынка не значыцца.

Агулам Сяргей Фешчанка патрабаваў ад УУС аблвыканкама і ДАІ 7 мільёнаў рублёў, але суд задаволіў яго патрабаванне толькі на 1 мільён 300 тысяч беларускіх рублёў.

Магілёўскі губернатар загаварыў па-беларуску

Кіраўнік Магілёўшчыны Пётр Руднік даказаў, што ведае матчыну мову. У Дзень Канстытуцыі ён загаварыў па-беларуску!

Днямі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік віншаваў групу юнакоў, якім уручыў пашпарты грамадзян Беларусі. І віншаваў іх па-беларуску.

Дарэчы, мясцовыя журналісты гавораць, што сам Пётр Руднік пакуль не часта размаўляе па-беларуску. Але вельмі часта прыгадвае, што трэба ведаць родную мову. Апошні раз ад яго беларускія словы гучалі на тэлебачанні летась, у жніўні. Тады афіцыйныя крыніцы распаўсюдзілі інфармацыю, што старшыня аблвыканкама загадаў распрацаваць план мерапрыемстваў па вяртанні беларускай мовы ў публічнае жыццё. 31 снежня "Комплекс першачарговых мер аблвыканкама па папулярызацыі беларускай мовы на 2010—2012 гады" быў падпісаны П.Руднікам.

Што ж, зычым поспеху добрай справе. Хай запісанае ў планах стане явай!

Яўген ІГНАТОЎСКІ.

Лепшы настаўнік Мінска працуе ў Чыжоўцы

У Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі прайшлі фінальныя іспыты гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства на званне "Лепшы настаўнік года".

Лепшым сталічным настаўнікам 2010 года стала выкладчыца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы №43 Заводскага раёна Мінска Алеся Зяневіч. Дарэчы, гэта зусім не элітная школа, і знаходзіцца яна ў так званым рабочым раёне — у Чыжоўцы.

Педагог скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка. Зяневіч мае найвышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, стаж яе педагагічнай дзейнасці — 15 гадоў.

Другое месца на конкурсе заняла настаўнік гісторыі сталічнай школы №199 Вера Сячкова, трэцяе — настаўнік фізікі школы №53 Алена Верайко. Лаўрэаты конкурсу, якія занялі II і III месцы, узнагароджаны Ганаровымі граматамі камітэта па адукацыі і прэміямі Мінгарвыканкама, а пераможца — граматай Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і прэміяй Мінгарвыканкама.

Сёлета ў гарадскім этапе конкурсу ўзялі ўдзел 33 педагогі.

Таццяна ДАРАШЧОНАК, БелаПАН.

Мілінкевіч вызначыцца ў маі

Як вядома, аб сваім намеры балатавацца ў прэзідэнты ўжо заявілі палітыкі Алесь Міхалевіч, Мікола Статкевіч і Андрэй Саннікаў.

Маўчыць пакуль экс-кандыдат у прэзідэнты, лідэр руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч, хоць чуткі аб яго чарговым удзеле ў прэзідэнцкай кампаніі ходзяць даўно.

Учора, адказваючы на пытанні журналістаў, Мілінкевіч, у прыватнасці, зазначыў: "Заявіць пра такі намер можна заўжды. Я перакананы, што праца на будучыя прэзідэнцкія выбары пачынаецца адразу пасля прайшоўшай кампаніі. Таму я яшчэ раз паўтарыўся: я хачу і гатовы ўдзельнічаць у чарговай прэзідэнцкай кампаніі. Канчатковае рашэнне на гэты конт агучу ў маі бягучага года".

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

СУД

Алег ВОЛЧАК: «Абвінавачанні прыцягнуты за вушы»

У Вярхоўным судзе Беларусі працягваецца разгляд справы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў — Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі. На лаве падсудных таксама Аляксандр Ларын і былы начальнік Гродзенскага ўпраўлення барацьбы з арганізаванай злачыннасцю Міхаіл Казлоў.

Аўтуховіча, Асіпенку і Ларына абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта ў дачыненні да двух чыноўнікаў — намесніка міністра па падатках і зборах Беларусі Васіля Камянко і былога губернатара Гродзенскай вобласці Уладзіміра Саўчанкі.

Падпалкоўніка міліцыі Міхаіла Казлова абвінавачваюць у тым, што ён, ведаючы аб планах падрыхтоўкі да тэрарыстычнага акта, не прыняў мер для яго прадухілення.

Асіпенка і Аўтуховіч абвінавачваюцца яшчэ і ў падпале дома былога начальніка Ваўкавыскага РУУС Сяргея Кацубы.

Справу разглядае суддзя Аляксей Цяцюхін. Абвінавачанне прадстаўляе пракурор Эльдар Сафонаў. Згодна з ягонай версіяй яшчэ ў 2005 годзе Аўтуховіч з пачуцця помсты быццам бы даў каманду Ларыну падпаліць дом начальніка Ваўкавыскага РУУС Кацубы.

Пракурор упэўнены, што Аўтуховіч стварыў злачынную групу, дзейнасць якой і каардынаваў. У склад банды быццам бы ўваходзілі Уладзімір Асіпенка, Аляксандр Ларын і іншыя. Больш за тое, для ажыццяўлення злачыннай дзейнасці гэта група быццам бы набыла гранатамёт РПГ-26, некалькі трацілавых шашак і электрадэтанатары.

Эльдар Сафонаў агучыў у судзе і тое, што летам 2005 года для захопу Васіля Камянко Аўтуховіч набыў у Маскве два электрашокеры. Тым жа летам Аўтуховіч быццам бы тайна сачыў за Камянко.

Па пракурорскай версіі ў 2005 годзе, знаходзячыся ў СІЗА, ён даў загад на замах супраць Уладзіміра Саўчанкі.

З гэтай нагоды быццам бы Ларын з дапамогай Асіпенкі прывёз у Гродна гранатамёт і наблізіўся на адлегласць у 140 метраў да дома былога старшыні аблвыканкама.

Аднак па версіі следства давесці справу замаху на Саўчанку да канца Ларын (а менавіта ён, па меркаванні пракурора, быў выканаўцам) не змог, бо пачалі з'яўляцца прахожыя, якія маглі перашкодзіць здзяйсненню злачынства.

Варта адзначыць, што ні Аўтуховіч, ні Асіпенка, ні Казлоў сваёй віны цалкам не прызнаюць. Больш за тое, прадпрымальнікі заяўляюць, што падчас правядзення следства на іх аказваўся ціск. Адзіны, хто "часткова прызнаў сваю віну", — Аляксандр Ларын. Праўда, у чым канкрэтна ён вінаваты, патлумачыць не змог...

Галоўны сведка абвінавачання — Уладзімір Саўчанка — у суд не з'явіўся, спаслаўшыся на дрэнны стан уласнага здароўя, ён дазволіў суду разглядаць справу ў ягоную адсутнасць.

На допыце ў судзе іншы фігурант справы Васіль Камянко адзначыў, што ў той час Аўтуховіч займаўся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю. Нягледзячы на тое, што дэкрэт Лукашэнкі забараняў наймаць на працу прадпрымальнікам больш за тры чалавекі, на "Ніка-Транс" працавалі 45 чалавек. "І кантралюючыя органы гэта пакрывалі".

Камянко прызнаўся, што ніколі не размаўляў з Аўтуховічам. Толькі аднойчы ў будынку міністэрства ён бачыў чалавека, падобнага да Аўтуховіча, які размаўляў з вахцёрам.

На пытанне, ці паступалі Камянко пагрозы, ён адказаў, што ўспрымае як пагрозу адкрытыя лісты Аўтуховіча да Лукашэнкі, дзе гаварылася пра "звядзенне рахункаў з чыноўнікамі, што твораць бясчынствы".

Іншы сведка абвінавачання — Сяргей Кацуба ў сваіх паказаннях адзначыў, што не ведаў, хто замаўляў падпал ягонага дома. Але ў той жа час ён упэўнены, што ў Аўтуховіча мог быць матыў. Бо ў свой час менавіта Кацуба канфіскоўваў аўтамабілі ў фірмы Мікалая Аўтуховіча.

"Абвінавачанні відавочна прыцягнуты за вушы", — так каменціруе ход судовага працэсу праваабаронца Алег Волчак. Сведкі абвінавачання блытаюцца ў сваіх паказаннях, не памятаючы, калі гаварылі праўду: на папярэднім следстве ці ў судзе. Адзін з абвінавачаных — Уладзімір Асіпенка ўвогуле заявіў, што "за правільныя паказанні" супраць Аўтуховіча яму абяцалі свабоду. Шчыра кажучы, не цягнуць на тэрарыстаў тыя людзі, якія апынуліся на лаве падсудных. Напрыклад, Ларын у сваіх паказаннях сказаў, што не мог уваходзіць у склад устойлівай злачыннай групы пад кіраўніцтвам Аўтуховіча, бо паміж імі склаліся непрыязныя адносіны. Нагадаю, што менавіта на паказаннях Ларына ў асноўным раней грунтавалася следства. Але, відавочна, што абвінавачанні рассыпаюцца..."

Працэс па справе Аўтуховіча абяцае быць доўгім. Учора ў судзе пачаў даваць паказанні Уладзімір Асіпенка. Падрабязнасці — у наступных нумарах.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Чакаецца візіт Віктара Януковіча ў Мінск

Пра гэта паведаміла ўпраўленне па сувязях са СМІ сакратарыята Кабінета міністраў Украіны па выніках сустрэчы Азарава з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімірам Макеем.

Паводле ўкраінскіх журналістаў, кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта сустрэўся ў Кіеве таксама са сваім украінскім калегам Сяргеем Лёвачкіным і Віктарам Януковічам.

Навошта жанчыне пагоны?

У 2009—2010 гадах на навучанне ў Ваенную акадэмію Беларусі плануецца прыняць 29 дзяўчат.

Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў начальнік упраўлення ваеннай адукацыі і падрыхтоўкі войскаў Узброеных сіл **Юрый Бугрэнка**.

Найбольшая колькасць — 20 дзяўчат — могуць стаць курсантамі авіяцыйнага факультэта, у тым ліку пяць — па лётнай спецыяльнасці "Эксплуатацыя паветранага транспарту і кіраванне паветраным рухам". Яшчэ дзевяць дзяўчат плануецца прыняць на факультэт сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання.

Паводле слоў Бугрэнкі, на 1 сакавіка курсантамі Ваеннай акадэміі выказалі жаданне стаць 46 дзяўчат. Зараз на авіяцыйным факультэце ВНУ вучыцца адна дзяўчына — па лётнай спецыяльнасці. Гэта ўраджэнка Бабруйска Наталля Малашэнка.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Зграя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але справа нават не ў гэтым. А каб мы і пісалі матэрыялы на гэтыя сайты?! І што?! У гэтым жа няма ніякага крыміналу. Як кажуць, маем законнае права!.. Як да журналістаў да нас з Марынай могуць быць прэтэнзіі толькі па артыкулах у газеце "Народная Воля", бо мы тут працуем, тут мы журналісты, тут мы абавязаны прытрымлівацца патрабаванняў Закона аб сродках масавай інфармацыі і перш чым надрукаваць чый-небудзь зварот, абавязаны правесці ледзь не расследаванне. Але як толькі я пішу ліст сябру, абмяркоўваю падзеі са сваякамі альбо дзялюся нейкай навіной праз інтэрнет — тут, прабачце, я ўжо магу не выбіраць слоў. Тут я, як і ўсе звычайныя людзі, не маю ні абавязкаў, ні паўнамоцтваў праводзіць расследаванні. Як і ўсе людзі, праз інтэрнет-дзённікі, каментары і таму падобнае я магу расказваць пра тое, што чула, што бачыла, з чым сутыкнулася.

Падабаецца гэта некаму ці не, але на тое і быў створаны інтэрнет, і так у ім кантактуюць адно з адным людзі ва ўсім свеце. І каб да мяне прыйшлі сваякі арыштаваных міліцыянераў, то я абавязкова б "выдала" калі не праз газету, то праз інтэрнет інфармацыю, што людзі абураны і маюць намер дайсці да Еўрапарламента, каб расказаць пра беззаконне. Скажу больш: калі б я сустрэла збеглага Дудкіна (хоць у Маскве, хоць у Нью-Йорку), то вытрасла б з яго душу, але дабілася б, каб ён патлумачыў, за што счапілася паміж сабою гэтая зграя, што яны дзеляць — уладу, грошы, палюбоўніц?

Можа, каму і хочацца, каб уся краіна гаварыла і думала аднолькава, каб пляскала ў далоні любому глупству кіраўнікоў, каб людзі не тое што дзейнічаць — думаць не па разнарадцы баяліся. Але я гэтага не хачу і ўпэўнена, што ператварыць Беларусь у паліцэйскую дзяржаву мараць толькі недапечаныя. І як грамадзянка сваёй краіны я маю права ні ў кога не пытацца, правільныя мае разважанні ці не, не прасіць ні ў кога дазволу, каб імі падзяліцца з іншымі. Канстытуцыя гарантуе ўсім нам права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі, свабоду меркаванняў і права на іх выказванне. На мой погляд, у гэтым сэнсе Закон аб СМІ супярэчыць Канстытуцыі і павінен быць адменены.

Але ў дадзеным выпадку Закон аб СМІ ўвогуле не мае да сітуацыі дачынення. Бо крымінальная справа ўзбуджана за артыкулы ў інтэрнеце. А пагроза прыцягнення аўтараў да крымінальнай адказнасці па крымінальным артыкуле "Паклёп" — гэта ўвогуле сведчанне неразумення таго, што маецца на ўвазе ў гэтым артыкуле. Бо вы, даражэнькія, спачатку азнаёмце нас — мяне, Коктыш, Радзіну, Халіп — з матэрыяламі "паляўнічай справы", з матэрыяламі праверкі дзейнасці і законнасці набыцця маёмасці генералам Каржом і ягонымі сваякамі, дачакайцеся, якія рэпартажы мы ў выніку напішам, а ўжо потым будзеце рабіць высновы. Гарантую: паклёпу не будзе — напішам праўду і толькі праўду. Бо для таго, каб абвінаваціць у паклёпе, нагадваю, спачатку трэба даказаць, што чалавек ведаў праўдзівую інфармацыю, а потым наўмысна сказіў яе.

Дарэчы, нас і не абвінавачваюць у паклёпе, бо гэта зусім ужо было б глупствам. Але нам і не тлумачаць нічога. Але калі ўжо з-за разборак паміж гомельскімі кадэбэшнікамі і міліцыянерамі падняўся такі вэрхал на ўвесь свет, то я лічу, што цывілізаваным выйсцем з сітуацыі было б наступнае:

1.Каб не засталося ніякага сумневу, каб не было двухсэнсоўнасці, прызначыць паўторную праверку адпаведнасці даходаў Івана Каржа ягонай маёмасці і маёмасці членаў сям'і генерала, а таксама дзейнасці Гомельскага УКДБ пад ягоным кіраўніцтвам у той частцы, якая не мае дачынення да дзяржаўных сакрэтаў, і абавязкова ўключыць у склад правяраючых Святлану Калінкіну, Марыну Коктыш, Наталлю Радзіну, Ірыну Халіп — тых, хто нібыта пакрыўдзіў Каржа. Прычым мы абавязуемся пісаць праўду і толькі праўду.

2.Калі ўжо "паляўнічая справа" ператварылася ў "паляванне на журналістаў", калі яна атрымала такі шырокі рэзананс, то ўлада цяпер проста абавязана яе рассакрэціць і дапусціць да вывучэння матэрыялаў незалежных журналістаў і праваабаронцаў. Тым больш што следства скончана, суд адбыўся, усе доказы сабраны, аргументы і кантраргументы прагучалі. Іншымі словамі, адкрытасць будзе толькі спрыяць аднаўленню справядлівасці, саб'е хвалю чутак і домыслаў вакол гэтай справы, супакоіць грамадства.

3.Тэрмінова вярнуць журналістам адабраную тэхніку, бо камп'ютэры — гэта наш працоўны інструмент. Адначасова пракуратура магла б вывучыць сітуацыю з пункту гледжання артыкулаў Крымінальнага кодэкса "Перавышэнне ўлады", "Перашкоды для законнай дзейнасці журналіста", "Правядзенне заведама незаконнага вобыску" і іншыя. Але мы не крыважэрныя: калі пракуратура проста правядзе "лікбез" для сілавікоў усіх узроўняў, падчас якога патлумачыць, у якіх выпадках па законе можа празначацца вобыск і як, зноў жа, па законе ён павінен праходзіць, нам будзе дастаткова. Дарэчы, юрысты ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" у сваім звароце да генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча звярнулі ўвагу на незаконнасць такіх беспадстаўных аблаў.

Але генпракурор пакуль нават ні слова не адказаў. У яго свае праблемы з той жа оперы. Справа ў тым, што ў нашай краіне адбылася яшчэ адна неверагодная і беспрэцэдэнтная падзея. Як паведамляла наша газета, у гэтым годзе ўступілі ў сілу змены ў заканадаўстве, згодна з якімі МУС, КДБ, Дэпартаменту фінансавых расследаванняў зараз не трэба браць у пракураў санкцыю на арышт альбо вобыск той ці іншай асобы, яны зараз самі сабе могуць такія санкцыі выпісваць. Як вынік — КДБ арыштаваў старшага следчага Генпракуратуры Святлану Байкову, якая вяла гучныя справы, фігурантамі па якіх праходзяць былыя і цяперашнія супрацоўнікі КДБ. Сапраўды, толькі ў нас такое можа быць: пракурор пачынае цікавіцца "дзеячамі з КДБ" — а КДБ у адказ выпісвае сабе санкцыю на арышт гэтага пракурора. Рыгор Васілевіч паспрабаваў уступіцца за Байкову, абскардзіў яе арышт у судзе Цэнтральнага раёна Мінска. Але... Суд не палічыў неабходным прыслухацца да меркавання генпракурора!

Ад таго, што адбываецца, юрысты проста бяруцца за галаву, бо гэта ўсё падзеі аднаго кшталту і, гаворачы па-руску, беспредел. Ужо ёсць звесткі, што паколькі некаторыя падрабязнасці "справы Байковай" апынуліся ў інтэрнеце, пачаўся пошук тых, хто мае да гэтага дачыненне. Нам што, зноў чакаць візіцёраў з санкцыямі на вобыск?..

Спыніць гэтыя войны, спыніць гэтыя расправы можа толькі публічнасць. Таму людзі, якія ўсё гэта твораць, кідаюцца на журналістаў, спрабуючы праўдамі і няпраўдамі пазатыкаць рты. Гэта ж як добра б ім было, каб мелі ўпэўненасць: можна рабіць што заўгодна, і ніхто пра гэта не даведаецца. Хацелася б, каб і кіраўніцтва дзяржавы нарэшце зразумела, што няма больш дзейснага сродку ў барацьбе з карупцыяй і беззаконнем, чым публічнасць. Усе іншыя метады — гэта толькі вайна кланаў, помста і імітацыя спробы "ачысціць шэрагі дзяржслужачых" ад пярэваратняў.

Калі Аляксандр Лукашэнка сапраўды хоча з карупцыяй змагацца і ачысціцца ад жулікаў у сваім атачэнні, то ён павінен спыніць гэтую зграю і прыслухацца да прапаноў дапусціць незалежных журналістаў да самых скандальных спраў апошняга часу. Ён абавязаны рабіць гэта, каб навучыць тых, хто сёння нібы з ланцуга сарваўся, і на будучае. Ён дакажа такімі дзеяннямі, што не апрычнікі галоўныя ў краіне, а закон. Ну а калі не, калі зробіць выгляд, што так і трэба, што галоўны закон сённяшняй Беларусі — права сілы, нахабства і свавольства, то гэтая зграя рана ці позна зжарэ і яго, і дзяцей ягоных. А потым пачне цкаваць і ўнукаў...

Народная Воля http://www.nv-online.info
19—22 САКАВІКА 2010 г.

ПОЗОР Алексея Ваганова,

или О том, как известный белорусский бизнесмен, воспользовавшись Указами президента Республики Беларусь №138 и №280, приобрел в собственность борисовский экс-колхоз «Гвардия» и довел его до ручки, а людей — до нищеты

Ухолода в Большой Ухолоде

Вначале все выглядело радужно. В 2004 году Совет министров во главе С.Сидорским, Минский облисполком под началом Н.Домашкевича, Министерство сельского хозяйства и продовольствия, местная вертикаль рьяно взялись за воплощение в жизнь Указов президента Республики Беларусь А.Лукашенко за номерами 138 и 280. Все нерентабельные сельские хозяйства решено было продать, как говорится, с молотка, за копейки, а точнее — всего за 20 процентов от стоимости чистых активов.

И желающих подставить плечо родному президенту и не менее родному правительству нашлось немало. Столичный бизнесмен, генеральный директор ЗАО "Лада ОМС Холдинг" Алексей Ваганов с радостью приобрел хозяйство на берегу реки Березина. Улыбаясь, он делился своими грандиозными планами: рядом трасса Брест—Москва, построим молочный завод, наладим производство продукции из птицы и будем все это поставлять не только в Минск, на местный рынок, но и в российскую столицу, где немало друзей.

Ах, мечты, мечты... Куда вы сплыли по Березине, на какой километр автотрассы вас занесло? Сегодня в деревне Большая Ухолода Борисовского района, где раньше был небезызвестный колхоз "Гвардия", а теперь базируются общество с ограниченной ответственностью "ОМС Агро" и ЗАО "Птицефабрика ОМС", действительно большая ухолода и ограниченная ответственность (считай, полная безответственность) новых хозяев за свои дела и поступки.

По мнению Александра Рара, директора центра России и Евразии в Германском совете по внешней политике, результаты прошедших выборов свидетельствуют о том, что избиратели начинают понимать различия, политические нюансы в тандеме Медведев—Путин. Рар оценивает итоги голосования как некоторое изменение политической атмосферы в России.

Он считает, что в России дело постепенно идет к созданию реальной многопартийной системы. Это процесс не одного дня, а лет на пять-шесть. Прошедшие же выборы это, по его словам, “первые ласточки”, отмечается на сайте “Немецкой волны”.

О снижении рейтинга “Единой России” отмечает и “Голос Америки”. Предварительные итоги региональных выборов в России показали меньшую, чем ожидалось, поддержку правящей партии “Единая Россия” на фоне растущего недовольства избирателей инфляцией и безработицей.

По предварительным итогам “Единая Россия” в общем и целом стала победителем, однако партия потерпела и ряд неудач, передает “Голос Америки”.

На Кубе арестованы 30 жен и матерей политзаключенных

Около 30 участниц организации под названием Las Damas de Blanca ("Женщины в белом") были задержаны, когда они шли маршем вместе с матерью заключенного, погибшего в прошлом месяце в ходе голодовки.

Женщины требовали освобождения около 50 критиков кубинского правительства, которые по-прежнему находятся под стражей после массовых арестов в 2003 году.

Орландо Запата Тамайо стал первым за четыре десятилетия диссидентом, скончавшимся в тюрьме в результате голодовки протеста. Организация "Международная амнистия" признала Тамайо узником совести, а его гибель вызвала волну международного осуждения и призывы к немедленному освобождению всех находящихся в заключении кубинских диссидентов.

Лидеры США и Ирландии отметили в Белом доме День Святого Патрика

Как заявил американский президент, 36 миллионов жителей Соединенных Штатах имеют ирландские корни, что является свидетельством прочных культурных, политических и экономических связей между двумя странами. Барак Обама заявил, что сохранение этих связей чрезвычайно важно как для США, так и для Ирландии.

В Таджикистане несколько человек стали жертвами снежной лавины

Она обрушилась на оживленную автотрассу Душанбе — Худжанд. сообщили ИТАР-ТАСС в Комитете по чрезвычайным ситуациям республики. Чудом спасшиеся водители и жители близлежащего селения сумели вытащить из снежного плена шесть человек. Оперативно подоспели спасатели и сотрудники ГАИ.

Политический ход Карпова

Анатолий Карпов, советский чемпион мира по шахматам, сделал новый ход, пишет Никола Ломбардоцци в статье, напечатанной в газете La Repubblica. Карпов выдвинул свою кандидатуру на пост президента ФИДЕ, могущественной международной федерации шахмат, которую в настоящее время возглавляет питомец Путина Кирсан Илюмжинов, президент Республики Калмыкия. Первым эффектом станет то, что кандидатуру Карпова поддержат иностранные федерации, например, Франции, Испании и Германии, но против выступит российская, которая встанет на сторону Илюмжинова.

Решение Карпова можно с уверенностью назвать политическим ходом. Любимец советского руководства после крушения СССР еще долгое время сохранял верность режиму. Но постепенно стал дистанцироваться от нынешнего правительства, пока не совершил шаг, открывающий ему новую дорогу.

От Афин до Лимы: составлен список столиц, подверженных риску разрушений

Города превращаются в "бомбы с часовым механизмом", сообщает итальянская газета La Repubblica.

Ученый из Калифорнийского университета Роджер Байлхем составил мировую карту городов, в которых в ближайшие 40 лет могут произойти катастрофические землетрясения. Рост городского населения, которое в ближайшие полвека может увеличиться до 2 миллиардов человек, является инструментом создания мощного оружия "массового уничтожения".

"Складывается впечатление, что землетрясения предпочитают наносить удары по самым слабым точкам нашей цивилизации", — говорит Мустафа Эридж, директор Стамбульского инженерного института, проанализировав карту, составленную Байлхемом. Стамбул является одной из таких слабых точек с сейсмической точки зрения. Только за последние 50 лет численность населения города увеличилась с 1 до 10 млн человек, и они живут в основном в домах, построенных без учета сейсмической опасности. Землетрясение такой силы, как на Гаити, могло бы привести к гибели от 30 до 40 тыс. человек.

"Бомбами с часовым механизмом" можно назвать Карачи, Катманду, Лиму и многие другие густонаселенные города, утверждает Байлхем. Повторение гаитянской катастрофы в Тегеране может привести к гибели миллиона человек. Некоторые иранские геологи уже обращались к иранскому руководству с предложением о переносе столицы, поскольку Тегеран расположен на очень активном разломе земной коры.

Сложная ситуация складывается и в городах со старыми и древними зданиями: Лиссабон, Мессина, Тирана, Афины. Подземные толчки силой 6—7 баллов по шкале Рихтера могут привести к катастрофическим последствиям.

Еще одной угрозой становятся газо- и нефтепроводы, построенные без учета сейсмоопасности, говорится в статье. В Стамбуле, например, имеется 30 тысяч трубопроводных веток, которые могут разрушиться под воздействием подземных толчков. "Если взорвутся хотя бы 10% трубопроводов, — говорят ученые, — возникнет 3000 пожаров, в то время как пожарные способны противостоять максимум 40 очагам возгорания в сутки".

МАРШРУТЫ

З Венесуэлы — у Бразілію

Візіт у Венесуэлу стаў толькі стартавай кропкай лацінаамерыканскага турнэ Аляксандра Лукашэнкі.

Як паведамляе РІА “Навіны” са спасылкай на мексіканскія СМІ, 22 сакавіка кіраўніка Беларусі чакаюць у Рыо-дэ-Жанейра. Там у Аляксандра Лукашэнкі запланавана сустрэча з прэзідэнтам Бразіліі Лула Інасіё да Сільва. Ці мае намер беларускі кіраўнік падчас сваёй паездкі наведаць іншыя краіны рэгіёна, не вядома. Пакуль галоўныя навіны прыходзяць з Венесуэлы.

Так, Аляксандр Лукашэнка і Уга Чавес закладзілі памятны камень у будучы жылы комплекс у горадзе Маракай, які будуць узводзіць беларускія будаўнікі. Таксама высокапастаўлены госць прапанаваў “сябру Уга” выступіць з ініцыятывай аб барацьбе з наркабізнесам у глабальным маштабе. А яшчэ, на думку Лукашэнкі, для рэалізацыі сумесных беларуска-венесуэльскіх праектаў неабходны новы магутны імпульс.

Пры гэтым на ўсялякі выпадак кіраўнік Беларусі нагадаў, што наша краіна не аддзяляе сябе ад Еўропы, з якой мае агульную культурную і гістарычную спадчыну, шмат у чым супадаючыя эканамічныя інтарэсы.

Лукашэнка і Чавес таксама прынялі ўдзел у цырымоніі ўрачыстага далучэння да венесуэльска-беларускага прадпрыемства па здабычы нафты “Петралера БелаВенесалана” газавых радовішчаў на газакампрэсарнай станцыі Сота. І, дарэчы, нафтавыя складнікі візіту беларускага кіраўніка ў Каракас выклікаюць найбольшы рэзананс у сусветных СМІ.

Так, паміж Чавесам і Лукашэнкам дасягнута дамоўленасць пра пастаўкі ў Беларусь венесуэльскай нафты, якая пасля пераапрацоўкі будзе прадавацца ў Еўропе. Эксперты, аднак, сумняваюцца, што праект будзе выгадны эканамічна.

Вось, напрыклад, меркаванне польскага аналітыка Анджэя Шчэсняка, якое ён выказаў у інтэрв’ю Радыё “Рацыя”.

— Ці сапраўды гэта рэнтабельна і выгадна для абодвух бакоў займацца перавозкай з Венесуэлы, потым перапрацоўкай, а нарэшце — продажам нафты?

— Нафта — гэта глабальны тавар, таму яе можна перавозіць з любога месца. Праблема ў тым, колькі яна каштуе. Калі марскі транспарт таннейшы за перакачку трубаправодам на вялікія адлегласці, кошт гэтага транспарту не будзе перашкодай, хутчэй перашкодай будзе якасць венесуэльскай нафты. Бо гэтая нафта — цяжэйшая, перапрацоўчы завод павінен мець адмысловае абсталяванне, якое патрэбна для гэтай перапрацоўкі. Таму, як ні парадаксальна, Венесуэла галоўным чынам экспартуе сваю нафту ў ЗША, хаця не мае з імі найлепшых дачыненняў. Усё гэта з той прычыны, што ў ЗША ёсць заводы, якія могуць тую нафту перапрацоўваць.

— Ці істотна прапісана ў дамове колькасць нафты з эканамічнага пункту погляду?

— Гэтая колькасць нафты, на маю думку, нават замалая, каб задаволіць патрэбы Беларусі. Бо Беларусь перарабляе ад 5 да 6 мільёнаў тон нафты на ўласныя патрэбы. Астатнія 20 мільёнаў тон перарабляе і экспартуе прадукты. Калі Беларусь атрымае венесуэльскую нафту нават з невялікай зніжкай, апускаючы нават тэхнічныя праблемы перапрацоўкі нафты, то гэтую нафту будзе цяжка экспартаваць, і прадукты перапрацоўкі з яе будуць даражэйшыя, чым з расійскай нафты. У гэтым праблема.

Венесуэла павінна ўсталяваць вельмі нізкія цэны, якія павінны канкурыраваць з расійскімі коштамі, мінусуючы нават падаткі, якія накладвае Расія, калі экспартуе сваю нафту, каб гэтая нафта магла быць даходам для Беларусі. Здаецца, Беларусь шукае пункт націску на Расію, каб атрымаць чарговы аргумент у перамовах. Хутчэй гэта аргумент у перамовах, чым рэальны ўплыў гэтай нафты. Галоўная праблема з гэтай нафтай — гэта лагістычная праблема, бо па гэты момант усё яшчэ не вядома, як нафта можа патрапіць у Беларусь.

— Іншымі словамі, гэта не дыверсіфікацыя, а правакацыя?

— Гэта хутчэй аргумент для перамоў. Лукашэнка выкарыстоўвае розныя метады перамоў і робіць гэта вельмі ўдала. Яму часта ўдаецца дамовіцца пра немагчымыя рэчы. Аднак гэты аргумент малаверагодны ад самага пачатку. Бо вядома, што нафта — гэта тавар, які чым бліжэй ляжыць, тым лепей. Але варта падкрэсліць, што беларускім прадпрыемствам удалося распачаць здабычу нафты ў Венесуэле. У невялікай колькасці, але здабываюць жа гэтую нафту, хаця да гэтай пары ўсе сумняваліся.

Алена НОВІКАВА.

Ежедневный доход — примерно 27 млн долларов

Карлос Слим, самый богатый человек планеты, чье состояние журнал Forbes оценил в 53,5 млрд долларов, все, что ни попадет ему в руки, превращает в деньги, пишет швейцарское издание Tagblatt. 70-летний Слим, сын ливанских иммигрантов, владеет крупнейшей телефонной компанией, ему принадлежат рестораны, торговые центры, производственные и добывающие предприятия, пенсионные фонды и авиакомпании. Его ежедневный доход составляет примерно 27 млн долларов.

Еще подростком с одобрения отца Слим начал играть на бирже и в 17 лет уже заработал свой первый миллион. "Я не Дед Мороз, благотворительность не решит проблему бедности", — сказал как-то Слим. Но после смерти жены он превратился в филантропа. Его фонд заботится главным образом об образовании подрастающего поколения. "Когда я умру, то с собой не возьму ничего", — говорит он теперь.

Шприц за 5 миллионов

Шприц, из которого поп-звезде Майклу Джексону была введена смертельная инъекция лекарства, пойдет с молотка в Лас-Вегасе.

Как сообщает британская Daily Telegraph, начальная сумма за этот шприц — 5 млн долларов. Предполагается, что шприц незаконно попал в руки нынешнего продавца и теперь предлагается на аукционах игорной столицы США. Адвокаты неназванного продавца, как и предписывает закон, предупредили семью погибшего певца о будущей продаже. По предварительным данным, выставить шприц на торги планируется 25 июня 2010 года — в день первой годовщины со дня смерти поп-идола.

СТАРОНКІ ПАМЯЦІ

Ілля КОПЫЛ

Нябышына. Вайна

(Працяг. Пачатак у №№30—41.)

Палкоўнік Іван Іванавіч Якубоўскі, ураджэнец Магілёўскай вобласці. Намеснік камандзіра танкавага корпуса. Двойчы Герой Савецкага Саюза. Пасля вайны ён займаў шэраг высокіх пасад, быў прызначаны намеснікам міністра абароны СССР, маршал Савецкага Саюза.

Генерал-маёр Зіньковіч з Магілёўшчыны. Камандзір танкавага корпуса, Герой Савецкага Саюза. Пры фарсіраванні Дняпра загінуў.

Палкавы камісар Фамін, абаронца Брэсцкай крэпасці, нарадзіўся ў мястэчку Колышкі Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Загінуў 30 чэрвеня 1941 года, абараняючы крэпасць.

Капітан Шаблоўскі нарадзіўся ў вёсцы Запалянне Быхаўскага раёна на Магілёўшчыне. Загінуў 24 чэрвеня 1941 года пры абароне Брэсцкай крэпасці.

Генерал-маёр Леў Міхайлавіч Даватар з вёскі Хоціна, што на Віцебшчыне. Камандзір кавалерыйскага корпуса, Герой Савецкага Саюза.

19 жніўня 1941 года ў бітве за Маскву генерал Леў Даватар загінуў (у горадзе Стаўрапалі генералу Даватару быў усталяваны 30-метровы помнік. Помнік узарвалі ў 2007 годзе, якраз у той час, калі Расія “бараніла” помнік савецкаму салдату ў горадзе Таліне (Эстонія).

Генерал-маёр Скрыганаў нарадзіўся ў Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці. Камандзір дывізіі, Герой Савецкага Саюза. Удзельнічаў у баях за Сандамірскі плацдарм. 26 студзеня 1945 года генерал Скрыганаў загінуў пры фарсіраванні ракі Одэр. Пахаваны ў Львове.

Ст. лейтэнант Аляксандр Гаравец нарадзіўся ў вёсцы Машканы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Гэта быў вельмі храбры лётчык. На фронце з чэрвеня 1942 года. За кароткі тэрмін знішчыў 11 самалётаў ворага. Удзельнік бітвы на Курскай дузе, якая адбылася на пачатку ліпеня 1943 года. За 4 дні ён збіў 8 самалётаў. 6 ліпеня 1943 года быў яго апошні бой. Ён заўважыў 20 бамбардзіроўшчыкаў праціўніка і нечакана напаў на іх. Ён збіў у гэтым паветраным баі 9 нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў. Ст. лейтэнант Аляксандр Гаравец — адзіны ў свеце лётчык, які ў гады вайны за адзін паветраны бой збіў столькі самалётаў. У гэтым баі загінуў і сам. 28 верасня 1943 года яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Яшчэ адзін беларус — лётчык Грыцавец. Ён стаў першым двойчы Героем Савецкага Саюза за 50 збітых самалётаў. Першымі героямі Савецкага Саюза яшчэ да вайны сталі лётчыкі-беларусы Селіцкі, Леванеўскі, Ляпідзеўскі.

Феадосій Арцёмавіч Смалячкоў нарадзіўся ў вёсцы Падгор’е Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Ён быў шараговым салдатам Ленінградскага фронту. Спачатку быў поварам, потым перавёўся ва ўзвод разведкі і, нарэшце, стаў снайперам. Першы раз снайперскую пазіцыю ён заняў 29 кастрычніка 1941 года і адразу знішчыў трох немцаў. У апошні раз ён выйшаў “на паляванне” 15 студзеня 1942 года. У гэты дзень яго ахвярамі былі чатыры фашысты, але і яго насцігла куля нямецкага снайпера. Усяго Смалячкоў знішчыў 125 фашысцкіх салдатаў і афіцэраў, патраціў 126 патронаў. Яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

19-гадовы Пётра Купрыянаў, жыхар вёскі Жодзіна Мінскай вобласці, 2 лістапада 1944 года паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Слынны савецкі разведчык, які дзейнічаў у Нямеччыне і Італіі напярэдадні вайны, Леў Маневіч нарадзіўся ў мястэчку Чавусы Магілёўскай вобласці. Гестапа яго арыштавала і змясціла ў канцлагер. Вызвалены амерыканцамі, памёр у Дзень Перамогі 8 мая 1945 года. Над яго магілай амерыканскія салдаты выканалі салют. Яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У СМІ прагучалі звесткі, што Беларусь дала Расіі і Савецкаму Саюзу 62-х адміралаў. Хто яны? На жаль, іх прозвішчаў я не ведаю.

Вышэй я прывёў некалькі прыкладаў таго, як змагаліся нашы землякі на франтах Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн. Каб апісаць гераізм беларусаў на той вайне, не хопіць ніякай кнігі. А як пачувалі сябе беларусы на акупаванай тэрыторыі, як яны сябе паводзілі — часткова аб гэтым я ўжо расказваў. Яшчэ раз паўтаруся, што тэзіс, быццам бы на Беларусі ішла Вялікая Айчынная вайна, прыцягнуты за вушы. У адносінах да Беларусі і беларускага народа гэта была драпежніцкая вайна, вынішчальная вайна, як з боку фашысцкай Германіі, так і з боку СССР. Супрацьстаянне партызан і паліцаяў — гэта супрацьстаянне Германіі і СССР. Даводзілася чуць і чытаць меркаванні ў СМІ, што ў Беларусі паралельна з вайной паміж СССР і Нямеччынай ішла грамадзянская вайна. Але я, як ні ўнікаў у працэсы, якія адбываліся ў маёй вёсцы і ў суседніх вёсках, прыкмет грамадзянскай вайны не заўважыў. Можа, хто-небудзь лічыць грамадзянскай вайной змаганне партызан супраць мірнага мясцовага насельніцтва? Але ж насельніцтва не аказвала партызанам ніякага супраціву. Яно пакорліва пераносіла ўсе іх здзекі.

Расклад сіл на акупаванай тэрыторыі

Немцы. У час вайны гэта была самая моцная ўзброеная сіла на нашай тэрыторыі, акупанты. Іх гарнізоны і камендатуры размяшчаліся ў гарадах, раённых цэнтрах, на чыгуначных станцыях. Галоўная іх задача — ахова чыгункі, бяспека руху эшалонаў з ваеннымі грузамі. У немцаў не хапала сіл і сродкаў, каб трымаць пад кантролем кожную вёску. Дый такой неабходнасці не было. Былі вёскі, у якіх бачылі немцаў 1—2 разы за ўсю вайну. Асабіста я іх бачыў тры разы. Да 1943 года мы з імі суіснавалі мірна. Пачынаючы з 1943 года, калі з’явіліся партызаны, якія сталі правакаваць немцаў, пачаліся карныя аперацыі.

Паліцаі. Беларусы не надта імкнуліся ў паліцаі. Іх колькасць складала ўсяго каля 30 тысяч. Гэтага было недастаткова, каб пры іх дапамозе ладзіць вайсковыя аперацыі, у тым ліку і карныя. Таму немцы на тэрыторыі Беларусі задзейнічалі паліцэйскія часці з іншых тэрыторый, напрыклад, з Прыбалтыкі. Мы ведаем, што Хатынь знішчана ўкраінскім паліцэйскім батальёнам.

У маёй вёсцы Нябышына ў паліцыю пайшоў усяго адзін жыхар. Нашу вёску абрабавалі і забілі 15 чалавек у маі 1943 года паліцаі, якія прыбылі з Докшыц.

Народнікі. Так мы называлі нямецкія часці, сфарміраваныя з савецкіх ваеннапалонных. Вышэй я ўжо апавядаў пра брыгаду палкоўніка Гіль-Радзіёнава. Такія часці знаходзіліся ў дваякім становішчы. З аднаго боку, яны лаяльна і нават прыхільна ставіліся да мясцовага насельніцтва, з другога — яны былі на службе ў немцаў і трэба было паказваць ім сваю дзейнасць і адданасць. Я не думаю, што немцы ім давяралі поўнасцю. Але ў іх не было іншага выйсця, не хапала сіл.

СБМ — Саюз беларускай моладзі. У нашай вёсцы такой арганізацыі не існавала, хоць моладзі было шмат. Я не ведаю, колькі сяброў было ў складзе СБМ. Розныя крыніцы даюць розныя лічбы. Яны хістаюцца ад некалькіх тысяч да некалькіх дзесяткаў тысяч, у залежнасці ад становішча на акупаванай тэрыторыі. Савецкая прапаганда заяўляла, што СБМ створаны па ўказцы з Берліна, што гэта фашысцкая здрадніцкая арганізацыя. Але ў гэтых юнакоў і дзяўчат былі самыя светлыя патрыятычныя памкненні. Яны дбалі пра незалежнасць Беларусі і шчыра верылі, што такое магчыма ва ўмовах нямецкай акупацыі. Да таго ж гаўляйтэр Беларусі Вільгельм Кубэ спрыяў моладзі СБМ у гэтым. І калі з Берліна паступіла прапанова пераўтварыць СБМ у вярбоўшчыка моладзі для накіравання на працу ў Нямеччыну, Кубэ не пагадзіўся з гэтым. Ён быў перакананы, што беларускую моладзь чакаюць больш важныя справы на Бацькаўшчыне, што ў першую чаргу ў моладзі трэба выхоўваць антыбальшавіцкі настрой. Гэтым самым, хоць і ўскосна, СБМ выратаваў ад адпраўкі на працу ў Нямеччыну дзесяткі тысяч маладых беларусаў. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў Чырвонай Арміяй лёс сябраў СБМ склаўся па-рознаму. Шмат хто з іх пакінуў Беларусь разам з немцамі, а потым эмігрыраваў у ЗША, Канаду, Аўстралію ды іншыя краіны і стаў вартым грамадзянінам тых краін. Многія змагаліся ў шэрагах Чырвонай Арміі. Але гэта іх не выратавала. Па іх следзе ішоў СМЕРШ. Сваё жыццё яны закончылі ў савецкім ГУЛАГу.

Асабіста я нават думкі не дапускаю, каб сябраў СБМ залічыць у здрадніку. Яны былі адданымі патрыётамі сваёй краіны — Беларусі. Мы імі павінны ганарыцца. Наша сённяшняя свядомая моладзь працягвае іх справу.

БНС — Беларуская народная самапомач. Распараджэнне аб стварэнні БНС Вільгельм Кубэ аддаў 22 кастрычніка 1941 года. У савецкіх крыніцах я знайшоў выключна абразлівую характарыстыку гэтай арганізацыі. Першым дакументам, які я прачытаў, была праца В.Раманоўскага “Саўдзельнікі ў злачынствах” (выдавецтва “Беларусь”, 1964 год). Асабіста я, як чалавек, які ўсю вайну пражыў у акупацыі, да зместу гэтай кнігі ставіўся крытычна, удумліва ўнікаў у тое, што можна было прачытаць паміж радкоў. У кнізе шмат напісана пра БНС, але нічога канкрэтнага. Я спрабаваў знайсці, колькі сяброў налічвала гэтая арганізацыя, але дарэмна. Таму можна лічыць, што БНС была параўнальна масавай арганізацыяй. Савецкай прапагандзе называць рэальную лічбу было нявыгадна. У “Народнай газеце” за 01.07.1993 года было надрукавана вельмі грунтоўнае даследаванне кандыдата гістарычных навук Галіны Кнацько “Мінск у гады акупацыі”. У гэтым даследаванні няма эмоцый, а ёсць спасылкі на архіўныя дакументы, ёсць табліцы, канкрэтныя лічбы. З матэрыялу бачна, якую велізарную працу выконвала БНС: бытавыя ўмовы жыцця мінчукоў, выплаты пенсій, арганізацыя харчавання, медычнае абслугоўванне, дзіцячыя ўстановы, арганізацыя прытулкаў і бясплатных абедаў для бяздомных і шмат што іншае.

Трэба адзначыць, што нямецкая акупацыйная ўлада пакінула ў Мінску савецкія парадкі. Дзейнічалі савецкія пашпарты, прапіска, аплата камунальных паслуг, аплата лістоў непрацаздольнасці, тыя ж памеры заробкаў і пенсій, кошты на тавары першай неабходнасці. Савецкія грошы хадзілі нароўні з акупацыйнымі дойчмаркамі. Працавалі ўсе прадпрыемствы і ўстановы, людзі як і раней хадзілі на працу. Мая стрыечная сястра перад вайной працавала на 5-м паштовым аддзяленні горада Мінска, на тым жа месцы працавала ў гады акупацыі, а потым і пасля вайны да выхада на пенсію.

БСА — Беларуская самаахова. З дазволу немцаў яна пачала стварацца ў ліпені 1942 года, а ў красавіку 1943 года была немцамі абязброена і распушчана. Аддзелы БСА не пускалі ў вёскі як партызан, так і паліцаяў. Немцы палічылі, што ўзброеныя вёскі стануць небяспечнымі і для іх.

Партызаны АК. У склад партызан Арміі Краёвай уваходзілі як палякі, так і беларусы. Яны дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы і Заходняй Беларусі. Да Бягомльскага раёна яны не дайшлі, таму я з імі не сустракаўся, звесткамі пра іх не валодаю. Чуткі хадзілі, што яны змагаліся з немцамі па-сапраўднаму. Але яны не жадалі, каб на іх тэрыторыю аказвалі ўплыў савецкія партызаны, таму змагаліся і з імі.

Партызаны прамаскоўскія. Пра іх досыць падрабязна я ўжо расказваў. Хачу адзначыць, гэта мае ўласныя высновы, што, калі б на тэрыторыі акупіраванай Беларусі не было партызан, страты насельніцтва былі б значна меншымі, не было б спаленых вёсак, і мы пасля вайны хутчэй адбудавалі б сваю краіну. Я ўжо расказваў, як партызаны наўмысна правакавалі немцаў супраць мірнага насельніцтва. Мяне вельмі ўразіла і абурыла тое, што прамаскоўскія партызаны замест таго, каб аб’яднаць свае намаганні з намаганнямі партызан Арміі Краёвай у барацьбе супраць немцаў, распачалі барацьбу паміж сабой. Партызаны атрадаў (брыгад) Мядзведзева і Шляхтунова з самага пачатку былі падрыхтаваны супраць партызан Арміі Краёвай.

(Працяг на 6-й стар.)

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19—22 САКАВІКА 2010 г.

Нябышына. Вайна

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

Мірнае насельніцтва. У мяне няма даных, якая колькасць насельніцтва Беларусі была эвакуіравана ва ўсходнія раёны СССР. Я думаю, не шмат. Беларусь была акупіравана немцамі маланкава. Сталіца рэспублікі горад Мінск быў заняты немцамі на шосты дзень вайны. Ва ўмовах такой скарацечнасці падзей аб эвакуацыі не магло быць нават гаворкі. Кіраўніцтва рэспублікі і абласцей так мітусліва ўцякала, што на сталах іх кабінетаў засталіся ляжаць сакрэтныя, зусім сакрэтныя, асобай і дзяржаўнай важнасці дакументы, якія вельмі дапамаглі немцам усталяваць на захопленай тэрыторыі свой, з элементамі савецкага, парадак. Магчыма, гарадское насельніцтва з усходніх абласцей рэспублікі часткова было эвакуіравана. Напрыклад, сям'я майго будучага цесця, жыхара горада Оршы, была эвакуіравана ў Ульянаўскую вобласць. Гурты бежанцаў, якія рухаліся па дарогах на ўсход, вымушаны былі вяртацца назад, паколькі нямецкая армія наступала хутчэй і абагнала іх. Сельскае насельніцтва хутчэй за ўсё, цалкам засталося на акупаванай тэрыторыі. У сваіх успамінах я кіруюся досведам са сваёй вёскі Нябышына. Апынуўшыся ў акупацыі, мы і ў думках не мелі змагацца з акупантамі. У нас не было зброі, і ніхто не імкнуўся, каб яе набыць. Гэтым можна было наклікаць бяду не толькі на сваю сям'ю, але і на ўсю вёску. У нас было адзінае памкненне — выжыць. Таму мы сядзелі ціха. Мая вёска Нябышына была звычайнай вёскай, як і ўсе вёскі Беларусі, у якіх пражывалі такія ж самыя мірныя людзі. Я не чуў, каб хоць у адной з навакольных вёсак людзі ўзялі ў рукі зброю і выступілі адкрыта супраць акупантаў. Калі з'явілася чужая для нас партызанская навала, мая маці малілася Богу, каб у гэтую ноч партызаны абмінулі нашу хату.

Яўрэі. 26.09.04 г. на канале ТВЦ паказалі перадачу: "Вокзал Победы. Последний из гето". Я запісаў расказ яўрэйкі: "На 2-й день войны мы хотели эвакуироваться, но все дороги с Беларуси на Восток были перекрыты отрядами НКВД. При попытке пройти или проехать отряды НКВД открывали стрельбу. НКВД нас вернуло в руки немцев".

За знішчэнне яўрэяў нясуць адказнасць і Гітлер, і Сталін. Яны аднолькавыя злачынцы.

Страты Беларусі ў Другой сусветнай вайне

Пытанне даволі складанае, недаследаванае, заблытанае. Мне здаецца, што праўда хаваецца наўмысна, камусьці гэта выгадна. Доўгі час гаварылася, што ў Беларусі загінуў кожны чацвёрты чалавек. Гэта лічба ўспрымалася на веру. Як яна атрымалася, ніякіх тлумачэнняў ніхто не даваў. У мяне з'явілася жаданне даведацца, у выніку якіх абставін загінула столькі людзей— на фронце, ва ўмовах акупацыі ці неяк інакш. З маёй сям'і вайна забрала 4-х чалавек, і ўсе яны загінулі пры розных абставінах. Бабулю Насту забілі паліцаі ў маі 1943 года, бацька загінуў у вайне з Японіяй 19 жніўня 1945 года, старэйшы брат загінуў у партызанах выпадкова па неасцярожнасці, сярэдні брат Сяргей памёр з голаду ў блакадным Ленінградзе. Маё жаданне даведацца больш дакладна, больш падрабязна пра агульныя ахвяры вайны было марным, мае магчымасці абмежаваныя. У апошні час на самым высокім узроўні была агучана ўжо іншая лічба ахвяр, што за гады вайны загінуў кожны трэці беларус. А колькі загінула ўсяго? Зноў ніякага тлумачэння. Можа, да 65-годдзя Перамогі больш дакладна пералічаць ваенныя ахвяры?

Я пачаў шукаць крыніцы, каб атрымаць хоць нейкія звесткі па гэтым пытанні. Я наведваўся ў бібліятэкі, гартаў старыя падшыўкі газет і часопісаў. Нарэшце ў згаданай кнізе "Саўдзельнікі ў злачынствах". Аўтар запэўнівае, што ў сваёй працы ён карыстаўся архіўнымі дакументамі і матэрыяламі. З кнігі я даведаўся, што гітлераўцы за тры гады акупацыі Беларусі знішчылі 2.219.316 чалавек, што пацвярджаецца табліцай.

Вобласці	Знішчана мірнага насельніцтва	Забіта, закатавана ваеннапалонных	Вывезена ў нямецкае рабства
Мінская	317.515	101.590	20.815
Магілёўская	71.602	59.134	21.436
Віцебская	151.421	92.891	68.434
Гомельская	53.630	114.476	18.745
Бабруйская	82.194	54.013	15.275
Полацкая	105.211	157.007	52.599
Палеская	37.981	3120	23.047
Гродзенская	111.208	41.330	53.955
Брэсцкая	159.526	38.858	30.008
Баранавіцкая	181.179	88.407	33.775
Пінская	95.385	24.613	30.861
Маладзечанская	42.373	34.652	8828
Усяго	**1.409.225**	**810.091**	**377.776**

Табліца ўражвае сваёй "дакладнасцю": падлік зроблены да адзінага чалавека.

Давайце больш уважліва зірнём на гэтыя лічбы. Мы заўважым, што на тэрыторыі Беларусі забіта, закатавана 810.091 ваеннапалонных. Хто яны, гэтыя ваеннапалонныя? Відавочна, што гэта былі чырвонаармейцы вайсковых часцей Заходняй асобай ваеннай акругі, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі. Яны трапілі ў палон на пачатку вайны. Савецкая сістэма воінскай службы была пастаўлена такім чынам, што прызыўнікі ніколі не служылі на сваёй Радзіме побач з месцамі свайго пражывання. Беларусы служылі на Каўказе, у Сярэдняй Азіі, на Урале, Далёкім Усходзе, толькі не на тэрыторыі Беларусі. На Беларусі неслі службу ўраджэнцы Каўказа, Сярэдняй Азіі, хлопцы з расійскай глыбінкі. Вось тыя 810.091 загінуўшых палонных і былі імі. Брэсцкую крэпасць абаранялі больш за 300 чэчэнцаў. Залічваць усіх іх на баланс Беларусі не выпадае. Іх падлічыў Генеральны штаб Чырвонай Арміі і звесткі разаслаў у ваенкаматы па месцы жыхарства. Кожная краіна, кожная вобласць СССР вяла падлік сваіх ахвяр. Магчыма, у гэтай колькасці былі часткова і беларусы. Тады давайце разбяромся, колькі іх было і прыплюсуем да нашых ахвяр. Я лічу, што 810.091 загінуўшых палонных трэба мінусаваць ад агульнай колькасці загінуўшых мірных нашых грамадзян. Гэта значыць, трэба ўжо прытрымлівацца лічбы загінуўшых у 1.409.225 чалавек. Калі гэта не так, то трэба лічыць румынамі чырвонаармейцаў, загінуўшых пры вызваленні Румыніі, венграмі — чырвонаармейцаў, загінуўшых пры вызваленні Венгрыі, і нават лічыць немцамі чырвонаармейцаў, загінуўшых у баях на тэрыторыі Германіі! Гэтыя абсурдныя прыклады можна працягваць далей. Але мне здаецца, што і 1,4 млн чалавек — лічба завышаная. Сюды залічаны яўрэі, якіх эшалонамі везлі з акупаваных немцамі краін Еўропы ў Беларусь і тут знішчалі. Такіх, па розных крыніцах, налічваецца ад 50 тысяч да 250 тысяч. Не трэба іх залічваць у ахвяры Беларусі. Яны падлічаны ў тых краінах, адкуль іх вывезлі. Дык дзеля чаго нам двайная бухгалтэрыя? Можа, дзеля таго, каб выдаваць сябе яшчэ большымі пакутнікамі? Вышэй я вёў гаворку пра тыя ахвяры, якія панесла мірнае насельніцтва на акупаванай тэрыторыі. Але ж нашы землякі гінулі не толькі там. Чамусьці людскія ахвяры ў згаданай табліцы падлічаны дакладна да аднаго чалавека, што зрабіць было даволі цяжка. А вось пра тыя ахвяры, якія панесла Беларусь ад дзеянняў Чырвонай Арміі, ад дзеянняў Савецкай улады і партызан, даведацца ўвогуле немагчыма. Усё пакрыта таямніцай, усё засакрэчана. Хачу нагадаць яшчэ раз, што Другая сусветная вайна для Беларусі, для беларусаў пачалася не 22 чэрвеня 1941 года, а 1 верасня 1939 года. Таму ўзнікае шмат пытанняў, на якія хацелася б атрымаць адказы і тлумачэнні. Напрыклад, колькі беларусаў, якія былі ў складзе польскай арміі, загінула ў барацьбе супраць нямецка-савецкіх захопнікаў з 1 верасня 1939 года па 22 верасня 1939 года. Як мы ведаем, у гэты дзень адбыўся ганебны сумесны парад дзвюх "брацкіх" армій — нямецкай і савецкай. Сярод жаўнераў, якія трапілі ў нямецкі палон, было 70 тысяч беларусаў. Яны былі інтэрніраваны ў СССР у абмен на палякаў, трапіўшых у савецкі палон. Каму з іх ад гэтага абмену пашанцавала больш? Пытанне цынічнае. Дарэчы, савецкае кіраўніцтва ашукала немцаў, яно перадала ім толькі невялікую частку палонных палякаў, астатніх чакалі турмы, расстрэлы, ГУЛАГ. 46 тысяч палонных беларусаў выселілі ў Казахстан. Колькі ўсяго палякаў і беларусаў было ў савецкім палоне, мне невядома. Пасля параду 22 верасня 1939 года ў горадзе Брэсце вайна супраць заходніх беларусаў не спынілася і працягвалася да 22 чэрвеня 1941 года. На тэрыторыі Беларусі праводзіліся жорсткія карныя аперацыі супраць мірнага насельніцтва. У выніку гэтых аперацый з Заходняй Беларусі ў Сібір, на Поўнач, у Сярэднюю Азію было выслана 1.240.000 чалавек. За той жа перыяд было расстраляна 135 тысяч чалавек. У гэтай лічбе не ўлічаны палонныя беларусы, якія расстраляны разам з палякамі ў адпаведнасці з Пастановай Палітбюро ЦК КПСС "Аб расстрэле ваеннапалонных польскіх афіцэраў, чыноўнікаў, памешчыкаў, асаднікаў" ад 05.03.1940 года. Расстрэлы адбыліся ў красавіку 1940 года ў Катынскім лесе пад Смаленскам, у Старабельскім лагеры пад Харкавам, у Асташкаўскім лагеры Калінінскай вобласці, у ваколіцах Мінска — Курапаты, Дражня, Лошыца, парку Чэлюскінцаў і ў іншых месцах. Колькі ўсяго беларусаў расстраляна ў адпаведнасці з гэтай жахлівай пастановай, невядома.

Чаму мы адракаемся ад нашых суайчыннікаў, загінуўшых ад рук нкусаўцаў, спрабуем выкінуць іх з народнай памяці? Пытанняў шмат, а адказаў няма.

Вядома, што на працу ў Нямеччыну было вывезена 377.776 грамадзян Беларусі. А колькі іх там загінула? Невядома. Колькі іх пасля вызвалення адмовіліся вярнуцца на радзіму і з'ехалі ў Англію, Канаду, ЗША, Аўстралію і іншыя краіны? Ёсць звесткі, што такіх 260 тысяч. А гэта ж таксама нашы страты ў вайну. Хаця з якога боку на гэту справу паглядзець. Магчыма, наадварот, гэта нашы набыткі. З'ехаўшы ў іншыя краіны, нашы землякі сталі вартымі грамадзянамі тых краін, знакамітымі асобамі. Асабіста для мяне не мае значэння, якім чынам яны апынуліся за мяжой, на чыім баку яны былі ў часы Другой сусветнай вайны. Мы павінны ганарыцца імі. Калі б яны вярнуліся на Радзіму пасля 1945 года ці засталіся на Радзіме пасля вызвалення Беларусі, то яны на доўгія гады сталі б вязнямі савецкага ГУЛАГу і зніклі б у ім. Добра, што ў іх хапіла розуму своечасова ад'ехаць у замежжа.

Пасля 22 чэрвеня 1941 года ў першыя дні вайны нкусаўцы правялі масавыя расстрэлы вязняў, якія знаходзіліся ў савецкіх турмах на тэрыторыі Беларусі. Такія расстрэлы адбываліся пад Вілейкай і Чэрвенем, у вёсцы Трасцянец пад Мінскам і ў іншых месцах. Палітвязняў Віцебскай турмы нкусаўцы расстраляць не паспелі. Немцы ўжо былі ля сцен горада. Трэба было ратаваць сябе і свае сем'і. Таму нкусаўцы аблілі сцены турмы бензінам і падпалілі. Палітвязні згарэлі жыўцом. Гэта ўсё нашы страты. Колькі людзей было знішчана вось такім метадам, невядома.

Беларусы змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе армій іншых краін — у англійскай, амерыканскай, канадскай, французскай. Колькі іх там усяго было, колькі загінула, дзе іх пахаванні, ці ўскладаюць кветкі на іх магілы супрацоўнікі нашых амбасад у тых краінах хаця б раз на год? Вядома, што ў складзе арміі польскага генерала Андэрса змагалася больш за 50 тысяч беларусаў. Армія вызваляла ад немцаў Італію, пры гэтым загінула 1270 нашых землякоў. Якім чынам яны ўлічаны ў агульнанацыянальных стратах Беларусі?

Я ўжо казаў, што мы дакладна ведаем, колькі мірнага насельніцтва знішчана немцамі на акупаванай Беларусі. А колькі насельніцтва знішчылі партызаны? Яны ж таксама палілі вёскі, расстрэльвалі людзей. Гэта было! Зноў няма адказу. Не абнародавана нават лічба, колькі партызан-беларусаў загінула пры сутыкненнях з немцамі. Невядома, якія людскія страты панесла Беларусь ад выканання загада Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання №270, які ваеннапалонных чырвонаармейцаў аб'яўляў здраднікамі і дазваляў арышты іх сем'яў?

З 1,5 мільёна беларусаў, якія ваявалі ў складзе Чырвонай Арміі, загінуў 1 мільён, у іх ліку і мой бацька. Гэта вельмі шмат — 66,3%. Масавая гібель чырвонаармейцаў-беларусаў прыпадае на 1944 год. Прычына гэтага вядома.

(Працяг будзе.)

КАДРЫ

Вяртанне Ворсіна

61-гадовы намеснік генеральнага сакратара ЕўрАзЭС, былы міністр спорту і турызму Беларусі Яўген Ворсін з'яўляецца адзіным кандыдатам на пасаду старшыні Федэрацыі хакея краіны, паведаміў БелаПАН прэс-сакратар ФХРБ Аляксандр Ванковіч.

Паводле яго слоў, Ворсіна вылучылі хакейны клуб "Гомель" і Гомельскае абласное грамадскае аб'яднанне "Федэрацыя хакея".

Пазачарговая выбарная канферэнцыя федэрацыі адбудзецца 18 сакавіка.

Нагадаем, што 21 студзеня дэлегаты пазачарговай справаздачна-выбарнай канферэнцыі ФХРБ не змаглі абрацъ новага старшыню, пасада якога вызвалілася пасля адстаўкі былога міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Навумава. Адзіны кандыдат — старшыня Цэнтральнага савета БФСТ "Дынама", былы начальнік службы бяспекі прэзідэнта, былы старшыня ФХРБ (1997—2001) Юрый Бародзіч — зняў сваю кандыдатуру, спаслаўшыся на занятасць.

Выканаўцам абавязкаў старшыні федэрацыі быў абраны яе спартыўны дырэктар Уладзімір Швабоўскі.

12 сакавіка прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях развіцця хакея і даручыў пабудаваць "трывалую вертыкаль" у гэтым відзе спорту. Нарада была сапраўды разгромнай. І адным з дакладчыкаў на ёй быў Яўген Ворсін.

SOS!

Небяспека з калодзежа

У шэрагу раёнаў Беларусі ўтрыманне нітратаў у калодзежнай вадзе ў 10—20 разоў перавышае ўстаноўленыя нарматывы. Пра гэта паведаміў вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гідрагеалогіі РУП "Беларускі навукова-даследчы геолагаразведачны інстытут" Раман Станкевіч.

Паводле яго слоў, такія перавышэнні адзначаюцца найперш у рэгіёне Палесся. У вадзе некаторых калодзежаў утрыманне нітратаў дасягае 800 мг/л, у той час як у адпаведнасці з нарматывамі дапушчальным з'яўляецца паказчык 45 мг/л. Спецыяліст адзначыў, што на смак вада з нітратамі не адрозніваецца ад чыстай.

Як паведаміла доктар-гігіеніст аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына Жаўняк, у цэлым па Беларусі ў 2009 годзе павышанае ўтрыманне нітратаў адзначалася ў вадзе 28,6% калодзежаў. *"Гэта тлумачыцца нашай мінулай інтэнсіфікацыяй сельскай гаспадаркі і выкарыстаннем мінеральных угнаенняў"*, — сказала спецыяліст. Паводле яе слоў, падземныя воды набраліся гэтых солей, у выніку яны трапляюць у калодзежы.

Спецыяліст заявіла, што вада з павышаным утрыманнем нітратаў асабліва небяспечная для грудных дзяцей. У немаўлят, якіх кармілі разведзенай у такой вадзе сумессю, можа развіцца кісароднае галаданне. У Беларусі адзначаліся нават выпадкі смерці грудных дзяцей з гэтай прычыны. Для дарослых спажыванне вады з павышаным утрыманнем нітратаў павялічвае рызыку развіцця раку.

Паводле слоў Жаўняк, вырашыць праблему ачысткі калодзежнай вады ад нітратаў вельмі складана. Таму сельскім жыхарам, у калодзежах якіх выяўлена павышанае ўтрыманне нітратаў, для стрававання рэкамендуецца выкарыстоўваць бутыляваную ваду.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ, БелаПАН.

ЕСТЬ ВОПРОС...

Совершили ДТП и скрылись?

Часто читаешь: человек совершил дорожно-транспортное происшествие и скрылся. Конечно, на это способны люди с низкой моралью. Будь моя воля, я наказывал бы их на полную катушку. А у нас, видимо, законы такие, что им плевать…

Федор КОНОВАЛЬЧИК, Гродно.

Может Вы, уважаемый читатель, и правы, но работники ГАИ могут действовать только в рамках закона. А он теперь гласит, что за оставление водителем места ДТП, участником которого он являлся, штраф составляет от 5 до 25 базовых величин или лишение права управления транспортными средствами до 2-х лет (от 170 до 875 тысяч рублей).

ТРАГЕДИЯ

«Вы снимаете, а у меня сына мертвого привезли…»

8 марта в России случилась трагедия. Шестеро белорусских туристов попали под снежную лавину. Из всей группы спастись удалось только двоим. История гибели молодых людей, старшему из которых не было и тридцати, полна вопросов, ответы на которые искала "Народная Воля".

Круговая порука скорби

О том, что в живых из всей группы осталось только двое, стало известно 11 марта. На протяжении трех дней с момента схода лавины родственники и друзья ждали любой весточки. После этого сообщения МЧС родным наверняка пришлось пережить немало потрясений: дорога в Мурманск на опознание, тяжелые сборы назад, подготовка к похоронам...

15 марта в 22.00 на Брестский вокзал прибыл поезд "Минск—Брест". К обычному составу был присоединен еще один, закрытый вагон. В нем через тысячи километров в Беларусь были доставлены тела погибших и их вещи.

Вместе со спецвагоном в Брест вернулись родители погибшей **Дарьи Троцинской** и выжившие **Александр Юрага** и **Дмитрий Фомин**. Оба туриста сразу же отказались от каких бы то ни было комментариев для прессы и на последующих поминальных встречах замечены не были.

Разгружали вагон вручную — силами тех, кто пришел встречать тела своих родных, близких, друзей. Назвать обстановку, которая царила на вокзале, нервной, значит по меньшей мере недооценить тяжесть состояния пришедших на вокзал... Милиция не выставляла специального оцепления, с этой задачей справились сами родные.

Родственники запретили любую съемку и отказались общаться с журналистами. Заприметив камеру, они тут же окружали оператора и не только пытались отгородить собою транспортировку тел, но и вытолкнуть журналиста с перрона. По мнению большинства, съемка в таком положении могла оскорбить память погибших.

Попытка репортера "Народной Воли" сделать несколько фотоснимков чуть не закончилась потасовкой. Родственники погибших пытались забрать фотоаппарат и удалить записи. Лучше любого упрека и запрета сработали слова отца одного из погибших: *"Вы снимаете, а у меня сына мертвого привезли..."*

«Нет слова "умерший"...»

Резонанс, вызванный гибелью молодых людей, был настолько широким, что родственники согласились провести гражданскую панихиду по погибшим. Утром 16 марта любой желающий мог проститься с молодыми людьми в фойе Ледового дворца Бреста. На этот раз никто не протестовал против съемок — родственники сидели около гробов, не замечая, что происходит вокруг. В зале постоянно находилось около ста человек, но большинство не выдерживало гнетущей атмосферы и быстро покидало скорбное место. Пришедшие приносили цветы и молча отходили в сторону.

В Ледовый дворец приехали и первые лица Бреста. Мэр города **Александр Палышенков,** так же как и рядовые граждане, не скрывал своих эмоций.

"Погибли молодые люди... Мне как человеку, пережившему смерть сына, тяжело смотреть на это. Но что поделаешь... Значит, судьба у них такая", — поделился мэр с "Народной Волей".

"Я тут и в качестве официального лица, и просто как обычный человек, — рассказал на панихиде "Народной Воле" начальник управления физической культуры, спорта и туризма Брестского облисполкома **Николай Хевук**. — *Я хорошо знаю Михаила Троцинского — отца погибшей Даши Троцинской. Молодые люди уже отошли, их уже не вернешь..."*

Михаил Троцинский и его жена первыми отправились в Мурманск после того, как стало известно о трагедии. Михаил Витальевич работает начальником отдела внешнеэкономических связей Брестского облисполкома. Его дочери Дарье было 26 лет, она имела педагогическое образование и встречалась с руководителем туристической группы **Михаилом Карпешем**.

В группе была еще одна пара — погибшие 23-летняя **Александра Ковган** и 24-летний **Евгений Траскевич**.

После гражданской панихиды родственники и близкие отправились в Свято-Воскресенский собор Бреста, где прошло отпевание усопших.

На литургии присутствовали в основном самые стойкие. С того момента, как поезд "Минск—Брест" остановился на перроне, неподалеку от родственников и близких погибших постоянно дежурила машина "скорой помощи".

Закончив службу, священник обратился к собравшимся в храме: *"В церкви нет слова "умерший", мы говорим "усопший". Это значит, что человек не исчезает бесследно, он сохраняет душу".*

Помним...

Внезапная гибель туристической группы настолько шокировала брестчан, что от комментариев отказывались почти все, кто знал умерших. Даже соболезнования многие оставляли в интернете, боясь потревожить родственников.

Такие слова адресованы брату одного из погибших туристов в популярной социальной сети:

"...Ни одни слова не выразят той боли, которую мы испытываем, тем более ты и твои родные... Но ты должен быть сильнее. Ты нужен нам, ты нужен маме. Держись... Если что нужно — ты только позвони... А ребята... Они навсегда останутся у нас в памяти — живыми..."

Высказывались даже незнакомые люди:

"Мы не знакомы... но больно до ужаса от этой потери... соболезную близким и друзьям", — такую запись оставила девушка на странице 23-летней **Александры Ковган.**

После того, как произошла трагедия, многим начало казаться, что ребята игнорировали знаки, которые предупреждали их об опасности. Знакомые погибших туристов говорят о том, что не продуман был не только маршрут. Даже снаряжение группы было неполным — что-то важное брать с собою просто не стали...

Ловозерская подкова

Александр Юрага, **Дмитрий Фомин**, **Михаил Карпеш**, **Евгений Траскевич**, **Дарья Троцинская** и **Александра Ковган** — бывалые туристы, которые совершили не один туристический поход.

Трагедия произошла в Ловозерском районе Мурманской области, на перевале Тавайок, в 26 км от поселка Ревда. Этот район ежегодно привлекает множество любителей турпоходов со всех концов света. Тут существует железнодорожная круглогодичная связь с "большой землей". Привлекают путешественников и загадочные истории о Ловозерской подкове — это священное место для народа саами, в котором, по преданию, могут происходить загадочные вещи.

На маршрут белорусы встали 3 марта. Через пять дней и произошел роковой сход лавины, который унес жизни четырех туристов. Спасшиеся **Александр Юрага** и **Дмитрий Фомин** пытались найти своих товарищей сами, но у них ничего не вышло. Не смогли они и вызвать спасателей по телефону. Чтобы найти помощь, им пришлось пешком отправиться в поселок Ревда. До населенного пункта туристы добрались только вечером следующего дня. Все это время их товарищи оставались в снежном плену.

Белорусские туристы сами составляли карту маршрута и не стали регистрироваться в местном поисково-спасательном отряде. Не остановило группу и предупреждение о плохих погодных условиях.

Такой подход к делу удивил не только спасателей, но и тех, кто хорошо знал пострадавших. Руководитель группы 29-летний **Михаил Карпеш** вместе с **Евгением Траскевичем** работал промышленным альпинистом, давно и серьезно занимался туризмом. Руководитель туристического клуба "Берестье" **Владимир Гусев** на все вопросы журналистов отвечал, что для пострадавших это был не первый поход и они знали что делают. По мнению Гусева, виною всему стали плохие погодные условия. Ухудшило ситуацию и то, что группа фактически не позаботилась о мобильной связи. При этом Михаил Карпеш ранее уже посещал злополучный перевал.

"Когда идешь в горы, всегда надо иметь при себе поисковые маячки, рации или хотя бы телефоны, — рассказывает турист со стажем из Минска **Евгений**. — *Это обязательно, об этом знает любой человек, который хоть раз ходил в поход. Лавину предугадать невозможно. На Кавказе опасные места заблаговременно расстреливают из пушек, но это не Кавказ..."*

Мария МАЛЕВИЧ. Фото автора.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19—22 САКАВІКА 2010 г.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 22 МАРТА

Первый

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 “Новости”.
06.05, 07.10, 08.15 “Доброе утро, Беларусь!”.
07.05, 08.10, 18.50, 00.25 “Зона Х”.
07.30, 08.25, 11.50 “Деловая жизнь”.
08.30 “В мире моторов”.
09.05 “Nota Bene”.
09.35 “Звездные танцы. Мужской сезон”.
11.00, 17.20 “Не родись красивой”. Сериал.
12.10 “Синьор 15 шаров”. Худ.фильм.
14.05 “Жизнь как жизнь”.
15.15, 19.15 “Новости региона”.
15.25 “Культурные люди”.
15.55 “Здоровье”.
16.20 “Огни большого города”. Сериал.
18.25 “Прости меня”.
19.25 “КЕНО”.
19.30 “Арена”.
19.55 “Ответный ход”.
21.00 “Панорама”.
21.55 “Специальный репортаж”.
22.30 “Доктор Хаус-4”. Сериал.
23.35 “Герои-3”. Сериал.
00.30 “День спорта”.

ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 00.35 “Наши новости”.
06.05 “Наше утро”.
09.05 “Контуры”.
10.10 “Дыхание планеты”.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 00.50 “Новости спорта”.
11.10 “Теория невероятности”.
12.00 “Малахов +”.
13.10 “Понять. Простить”.
13.40 “Модный приговор”.
14.45 “Контрольная закупка”.
15.15 “Виола Тараканова. В мире преступных страстей”. Сериал.
16.15 “Монтекристо”. Сериал.
17.10 “Наше дело”.
18.30 “Мачеха”. Сериал.
20.00 “Столичные подробности”.
20.20 “Добрый вечер, малыш!”.
20.30 “Хочу ребенка”. Худ.фильм.
22.55 “Столичный футбол”.
